WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

30 ЛІСТАПАДА 2011 г.
СЕРАДА
№ 228
(27092)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА АБМЕРКАВАЎ З ВІКТАРАМ КАМЯНКОВЫМ ДЗЕЙНАСЦЬ ГАСПАДАРЧЫХ СУДОЎ БЕЛАРУСІ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 29 лістапада правёў рабочую сустрэчу са старшынёй Вышэйшага гаспадарчага суда Віктарам Камянковым.

У ходзе сустрэчы абмяркоўваліся пытанні функцыянавання эканомікі, якія вынікаюць з дзейнасці гаспадарчых судоў, а таксама асобныя важныя моманты ў рабоце Беларускай федэрацыі баскетбола, якую таксама ўзначальвае Віктар Камянкоў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

БЕЛАРУСЬ І В'ЕТНАМ ПЛАНУЮЦЬ У БЛІЖЭЙШЫЯ 3-5 ГАДОЎ ПАВЯЛІЧЫЦЬ АБ'ЁМ УЗАЕМНАГА ГАНДЛЮ Ў ДВА-ТРЫ РАЗЫ

Аб гэтым паведаміў журналістам у ходзе афіцыйнага візіту ў В'етнам па выніках перагавораў з прэм'ер-міністрам гэтай краіны Нгуен Тан Зунгам прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч, перадае БЕЛТА.

Кіраўнік беларускага ўрада адзначыў, што ў ходзе перагавораў бакі абмяняліся падыходамі па развіцці двухбаковых адносін. Пункты гледжання Беларусі і В'етнама па большасці пытанняў супалі. У прыватнасці, адзначана, што ўзровень гандлёва-эканамічных адносін паміж краінамі пакуль не адпавядае іх патэнцыялу. «Сёння мы вызначылі напрамкі, дзякуючы якім у бліжэйшыя 3-5 гадоў у 2-3 разы павялічым аб'ём узаемнага гандлю», — сказаў Міхаіл Мясніковіч. Ён падкрэсліў, што падтрымлівае меркаванне прэм'ер-міністра В'етнама аб тым, што краіны могуць выконваць большую колькасць інвестыцыйных праектаў. У сувязі з гэтым Беларусь гатова ствараць новыя заводы ў В'етнаме па вытворчасці канкурэнтаздольнай прадукцыі, якую можна будзе пастаўляць як на ўнутраны рынак, так і на рынкі трэціх краін. Міхаіл Мясніковіч дадаў, што ў час перагавораў бакі таксама дамовіліся аб механізмах, якія дадуць магчымасць Беларусі купляць больш прадукцыі ў В'етнама. А гэта дадатковыя рабочыя месцы і даходы в'етнамскіх кампаній.

Фота БЕЛТА.

Прэм'ер-міністр Беларусі звярнуў увагу на тое, што Беларусь і В'етнам маюць адзінства поглядаў на перспектывы двухбаковых адносін. У студзені наступнага года краіны адзначаць 20-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін. За гэты невялікі ў гістарычным плане перыяд праведзена вельмі сур'ёзная работа па ўмацаванні двухбаковых сувязяў. «Мы пераканаліся, што В'етнам з'яўляецца надзейным партнёрам Беларусі ў Паўднёва-Усходняй Азіі, і наша краіна імкнецца быць такім жа партнёрам В'етнама ў Еўропе», — сказаў ён. Беларускі бок уражваюць поспехі В'етнама ў сацыяльным і эканамічным развіцці. «Вы правялі сур'ёзныя эканамічныя рэформы, ажыццяўляеце палітыку адкрытасці. Гэта імпануе, і мы можам шмат чаму ў вас вучыцца», — рэзюмаваў прэм'ер-міністр Беларусі.

Міхаіл Мясніковіч падчас перагавораў прапанаваў стварыць больш камфортныя ўмовы для супрацоўніцтва кампаній Беларусі і В'етнама. Кіраўнік беларускага ўрада адзначыў, што беларуска-в'етнамскія адносіны развіваюцца даволі дынамічна, у той жа час патрэбны новыя формы работы. На яго думку, бягучы афіцыйны візіт беларускай дэлегацыі ў В'етнам дасць магчымасць стварыць больш камфортныя ўмовы для работы беларускіх і в'етнамскіх кампаній. У сваю чаргу Нгуен Тан Зунг падкрэсліў, што высока ацэньвае рэзультатыўнасць бягучых перагавораў. «Я лічу гэты візіт важнай вяхой у развіцці двухбаковых адносін», — заявіў прэм'ер-міністр В'етнама.

Кіраўнік беларускага ўрада адзначыў важнасць сумесных інвестыцыйных праектаў дзвюх краін. «Інвестпраекты ідуць, няхай іх пакуль недастаткова, але яны дапамогуць перайсці на новую ступень нашага ўзаемадзеяння — да сумеснай вытворчасці прадукцыі, у тым ліку грузавікоў і рухавікоў, аб гэтым мы ўжо дамовіліся», — сказаў Міхаіл Мясніковіч. На яго думку, перспектыўнае партнёрства дзвюх краін і ў радыёэлектроніцы. Асаблівую ўвагу прэм'ер-міністр удзяліў пытанням развіцця супрацоўніцтва Беларусі і В'етнама ў спартыўнай сферы. Беларускія спартсмены зацікаўлены ў правядзенні трэніровак на спартбазах В'етнама, аднак для гэтага неабходна спрасціць візавы рэжым. Беларусь у сваю чаргу гатова прадаставіць свае спарткомплексы для падрыхтоўкі спартсменаў В'етнама. «Наша спартыўная база адпавядае міжнароднаму ўзроўню, і мы гатовы да партнёрства ў гэтай сферы», — заявіў Міхаіл Мясніковіч.

Кіраўнік беларускага ўрада адказаў на пытанні в'етнамскіх СМІ аб перспектывах двухбаковых гандлёва-эканамічных адносін, новых сумесных праектах, гуманітарным супрацоўніцтве, а таксама закрануў іншыя тэмы, звязаныя з партнёрствам дзвюх краін.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

г. Мінск.

У Брэсцкай вобласці знізілася колькасць зваротаў грамадзян па рабоце службаў ЖКГ

У Брэсцкай вобласці знізілася колькасць зваротаў грамадзян па рабоце службаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Аб гэтым учора журналістам паведаміў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Валерый Міцкевіч, які ўзначальвае міжведамасную рабочую групу па маніторынгу работы дзяржорганаў са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб па Брэсцкай вобласці, перадае БЕЛТА.

Валерый Міцкевіч нагадаў, што на папярэднім этапе маніторынгу ён таксама працаваў у Брэсцкай вобласці. І, паводле яго слоў, сёння адчуваецца розніца: стала значна менш зваротаў, якія датычацца работы службаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі. «Гэта сведчыць аб тым, што службы павярнуліся тварам да людзей і пачалі выконваць свае непасрэдныя абавязкі», — адзначыў Валерый Міцкевіч.

У Бярозе намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта пачаў работу з прыёму грамадзян у раённым выканаўчым камітэце. На прыёме ў яго нараўне з жыхарамі райцэнтра пабывалі людзі з іншых гарадоў вобласці, у тым ліку Белаазёрска, Брэста, Іванцэвіцкага, Пінскага, Баранавіцкага раёнаў.

Пытанні, з якімі звярталіся грамадзяне, датычыліся будаўніцтва, рэканструкцыі і крэдытавання жылля, работы судовых органаў, узніклі праблемы, звязаныя з атрыманнем рэгістрацыі, службовага жылля і інш. Потым Валерый Міцкевіч прадоўжыў размову з жыхарамі Бярозы на сустрэчы з працоўным калектывам ААТ «Бярозаўскі сыраробны камбінат». Рэспубліканскі маніторынг работы дзяржорганаў са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб праводзіцца ў адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы Адміністрацыяй Прэзідэнта Беларусі сумесна з КДК, Генпракуратурай і Дзяржсакратарыятам Савета Бяспекі з 28 лістапада па 2 снежня. У гэты перыяд ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі працуюць сем міжведамасных рабочых груп.

ЗНІЖКАМ КОЖНЫ РАДЫ. АСАБЛІВА НА КАЛЯДЫ

Традыцыйна з набліжэннем навагодніх свят пакрысе пачынае набіраць «абароты» «махавік» камерцыйных і забаўляльных мерапрыемстваў, што прызваны даць магчымасць прыдбаць патрэбнае да свята па зніжаных цэнах.

Так, паводле інфармацыі галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама, у сталіцы да канца года павінна прайсці каля 550 выстаў-дэгустацый харчовых тавараў, каля 1 тысячы выстаў-продажаў кулінарных і кандытарскіх вырабаў. Акрамя таго, на 300 выставах-продажах можна будзе набыць і нехарчовыя тавары. Ва ўнівермагах, універсамах, гандлёвых арганізацыях буйнога і сярэдняга фармату, у фірменных і спецыялізаваных крамах Мінска пройдуць больш за 370 распродажаў нехарчовых тавараў па зніжаных рознічных цэнах — за кошт змяншэння гандлёвых надбавак крамамі і адпускных цэн прадпрыемствамі-вытворцамі. У прыватнасці, надбаўкі на вялікі спектр замежнай і айчыннай прадукцыі будуць зніжаны на 10-50 працэнтаў.

Буйныя ўнівермагі да Каляд і Новага года правядуць акцыі (у кожным запланавана ад 30 да 50 такіх мерапрыемстваў), распродажы з дэманстрацыяй мадэляў і зніжэннем цэн, рэкламных гульняў з уручэннем падарункаў і прызоў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Беларусь з 1 снежня павышае экспартныя пошліны на нафту і нафтапрадукты

Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў № 1601 ад 26 лістапада 2011 года, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада.

З 1 снежня экспартная пошліна на нафту вырасце на 3,5 працэнта — $393 да $406,6 за 1 т. Адзіная стаўка экспартнай пошліны на светлыя і цёмныя нафтапрадукты (акрамя бензіну), якая з 1 кастрычніка ўніфікавана на ўзроўні 66 працэнтаў ад пошліны на нафту, з 1 снежня складзе $268,3 за 1 т супраць $259,3 у лістападзе. Такая ж пошліна ўстаноўлена на бензол, талуол, ксілолы. На бензіны таварныя і прамагонны бензін стаўкі вывазных мытных пошлін, зыходзячы з каэфіцыента 0,9, павышаны з $353,7 да $365,9 за 1 т. Пошліна на прапан, бутаны, этылен, прапілен, бутылен і бутадыен, іншыя звадкаваныя газы складзе $221,8 замест $236,5.

Пастановай унесены змяненні ў пастанову Савета Міністраў № 1932 ад 31 снежня 2010 года «Аб устанаўленні ставак вывазных мытных пошлін адносна нафты сырой і асобных катэгорый тавараў, выпрацаваных з нафты, і прызнанні страціўшымі сілу некаторых пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь». Дакумент прыняты ў адпаведнасці з указам № 716 ад 31 снежня 2010 года «Аб стаўках вывазных мытных пошлін».

З 1 кастрычніка гэтага года Беларусь услед за Расіяй ажыццяўляе разлік экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты па формуле «60/66». Размова ідзе аб прадукцыі, што вывозіцца з тэрыторыі рэспублікі за межы мытнай тэрыторыі Мытнага саюза. Формула разліку прадугледжвае, што стаўка экспартных пошлін на светлыя і цёмныя нафтапрадукты ўніфікуецца і разлічваецца з каэфіцыентам 0,66 (66 працэнтаў) ад стаўкі пошліны на нафту. Адначасова з 1 кастрычніка экспартная пошліна на нафту была зніжана шляхам скарачэння працэнта ад розніцы паміж цаной маніторынгу нафты і цаной адсячэння з 65 працэнтаў да 60 працэнтаў. Пры гэтым каэфіцыент разліку стаўкі пошліны на бензіны складае 0,90 (90 працэнтаў).

«Газпрам» і «Белтрансгаз» урэгулявалі пытанне аплаты газу

Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі ААТ «Газпрам».

Учора ў развіццё дасягнутых 25 лістапада дамоўленасцяў ААТ «Газпрам» і ААТ «Белтрансгаз» падпісалі дадатак да кантракта аб аб'ёмах і ўмовах пастаўкі газу ў Беларусь і транзіту газу праз яе тэрыторыю ў 2007—2011 гадах. У адпаведнасці з дакументам, ААТ «Белтрансгаз» ажыццяўляе частковую аплату прыроднага газу, які пастаўляецца «Газпрамам» у другім паўгоддзі 2011 года, па $244,8 за 1 тыс. куб.м, а не па цэнах трэцяга і чацвёртага кварталаў, разлічаных у адпаведнасці з кантрактам (адпаведна $279,16 і $305,72). Аплата астатняй сумы плацяжу за пастаўлены ў другім паўгоддзі 2011 года расійскі газ будзе праводзіцца «Белтрансгазам» штомесячнымі плацяжамі на працягу 2012 года.

КОШТ ПРОДАЖУ НЕРУХОМАСЦІ НА АЎКЦЫЁНЕ Ў ВІЦЕБСКУ ПЕРАВЫСІЎ ПАЧАТКОВЫ БОЛЬШ ЧЫМ У 9 ТЫС. РАЗОЎ

У Віцебску ўчора на аўкцыёне па продажы аб'ектаў дзяржуласнасці адзін лот прададзены за Br5,5 млрд, пры гэтым устаноўлены новы рэкорд перавышэння кошту продажу нерухомасці ў параўнанні з пачатковым — больш чым у 9 тыс. разоў. Папярэдні рэкорд (у 1,9 тыс. разоў) пратрымаўся крыху больш за год, паведаміла начальнік аддзела аўкцыёнаў і конкурсаў фонду «Віцебскаблмаёмасць» Ларыса Шчаглова.

Прадметам рэкордных таргоў стаў комплекс будынкаў і збудаванняў вытворчага прызначэння ў Полацкім раёне, якія належаць ААТ «Наваполацкжалезабетон». Цікавасць да нерухомасці выказалі сем патэнцыйных пакупнікоў. У выніку напружанай барацьбы на 96-м кроку аўкцыяніста вызначыўся пераможца, які прапанаваў за нерухомасць Br5,5 млрд. Паводле слоў прадстаўніка новага ўласніка, аб'екты плануецца выкарыстаць для стварэння вытворчасці металаканструкцый.

Усяго ў склад лота ўключана 17 будынкаў і збудаванняў агульнай плошчай больш за 40 тыс. кв. м, а таксама зямельныя ўчасткі агульнай плошчай больш за 11 га. Аб'екты нерухомасці прадаваліся з вызначэннем пачатковай цаны кожнага з іх у адну базавую велічыню (Br35 тыс.). Згодна з умовамі аўкцыёна, новы ўласнік абавязаны наладзіць прадпрымальніцкую дзейнасць і штогод на працягу пяці гадоў стварацьне менш за пяць працоўных месцаў.

БЕЛТА.

Ёсць пытанне

ЧАМУ ПЕДАГОГІ НЕ АТРЫМЛІВАЛІ КАМПЕНСАЦЫЮ НА ЛІТАРАТУРУ?

«Звязда» днямі паведаміла аб павышэнні кампенсацыйнай выплаты на набыццё педагогамі метадычнай літаратуры. Аднак ужо даўно «школьнае начальства» без дай прычыны адмяніла штомесячныя выплаты той хвалёнай кампенсацыі. Маўляў, з ёй адна толькі марока...

Масей БЯСПАЛЫ, *Гомельская вобласць*.

Як запэўнілі журналіста «Звязды» ў Міністэрстве адукацыі, у выплату бліжэйшай зарплаты (у большасці рэгіёнаў гэта пачатак снежня) педагогам будуць выплачаны адначасова тры кампенсацыі — за кастрычнік, лістапад і снежань, паколькі пастанова Міністэрства адукацыі распаўсюджвае сваё дзеянне на адносіны, якія ўзніклі з 1 кастрычніка 2011 года. Згодна з дакументам, кампенсацыя будзе выплачвацца па асноўным месцы работы пры ўмове занятасці (педагагічнай нагрузцы) не менш як 0,5 штатнай адзінкі (стаўкі). За кожны з трох месяцаў (кастрычнік, лістапад і снежань) педагогі атрымаюць кампенсацыю на набыццё вучэбнай, метадычнай літаратуры і перыядычных выданняў у памеры 22 650 рублёў. Кампенсацыя будзе выплачвацца незалежна ад знаходжання педагагічнага работніка ў працоўным водпуску, водпуску па цяжарнасці і родах, водпуску па доглядзе дзіцяці да трох гадоў, незалежна ад адсутнасці педагагічнага работніка на працы па прычыне часовай непрацаздольнасці. Захоўваецца выплата кампенсацыі і на час павышэння педагагічнымі работнікамі сваёй кваліфікацыі, перападрыхтоўкі, а таксама стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота БЕЛТА.

САМАЯ габарытная канструкцыя помніка героям вайны 1812 года ў Смаленскай вобласці адправілася з завода ААТ «Тэхналіт-Полацк». Яе вага складае 17 тон, даўжыня — 11 метраў. Поўную зборку канструкцыі ў пасёлку Чырвоны вышынёй 24 м і вагой 120 т плануюць завяршыць да 10 снежня. Урачыстае адкрыццё помніка запланавана на жнівень 2012 года. Да гэтага часу тут будзе весціся добраўпарадкаванне, у якім возьме ўдзел і «Тэхналіт-Полацк».

НА ЗДЫМКУ: канструкцыя помніка вайны 1812 года на трасе Полацк — Віцебск.

Парламенцкі дзённік

ДАЙ, КАМПАНЬЁН, НА ШЧАСЦЕ ЛАПУ МНЕ

БАЙЦОЎСКІ сабака загрыз немаўля. Хто з нас не памятае гэтую гісторыю, нават згадка пра якую ледзяніць душу? Колькі выпадкаў засталося па-за грамадскай увагай! Хіба яны менш трагічныя для кожнай сям'і... А перапоўненыя сабачыя і кашэчыя прытулкі? Наўрад ці яны сведчаць пра адказнае стаўленне да братоў нашых меншых. А кішэнныя сабачкі ў кавярнях — гігіенічна? А чуллівыя бабулькі, якія ладзяць сапраўдныя прытулкі ў сваіх хрушчоўках? Міласэрнасць? Скажыце гэта іх суседзям, якія задыхаюцца ад смароду. І гэта толькі тое, што ляжыць на паверхні. Праблема навідавоку. Народныя выбраннікі азадачыліся гэтым пытаннем. У выніку з'явіўся праект закона аб абыходжанні з жывёламі, распрацаваны менавіта дэпутатамі. Адзін з нямногіх, зазначым, у найноўшай гісторыі беларускага парламентарызму. Правам заканадаўчай ініцыятывы значна часцей карыстаюцца іншыя галіны ўлады. Так што, відаць, зачапіла.

Самая, бадай, цікавая навінка законапраекта — абавязковае чыпіраванне хатніх гадаванцаў. Чатырохлапы атрымлівае, па сутнасці, электронную метку, якая яго ідэнтыфікуе — гэткі ўжыўлены «пашпарт». Дбайным гаспадарам наяўнасць мікрачыпа дазволіць знайсці згубленага сябра. А нядбайнага будзе трымаць у цуглях: нават калі выкіне на вуліцу, гаспадара ўсё роўна вылічаць. З пункту гледжання тэорыі, абраны кірунак слушны. Трэба, каб утрыманне жывёл было цывілізаваным. Трэба, каб не было бяздомных сабачых зграй у нашых дварах. Але, як часта бывае з нашым менталітэтам, на практыцы ўсё не так прыгожа. Паклаўшы руку на сэрца, прызнаемся, усе мы далёкія ад думкі, што ўладальнікі шчанюкоў і кацянят выстраяцца ў чэргі на чыпіраванне. Асабліва калі прыплод з'явіўся ў вёсцы ці на летніку. Наколькі рэальна ўвасабленне заканадаўчай прапановы, цікавіўся ў Авальнай зале **дэпутат Уладзімір КУЖАНАЎ.**

— Я не кажу, што ўсе бабулі ў вёсках пабягуць чыпіраваць сваіх кацянят, — прызнае адна з аўтараў законапраекта **Ларыса ВЕРШАЛОВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанні.** — Але калі мы не прымем закон і не пачнем нешта рабіць, праблема ніколі не будзе вырашана. Гэта робіцца, каб зменшыць колькасць бяздомных жывёл.

Падобныя аргументы і ў яе калегі **Сяргея КАНОПЛІЧА, старшыні камісіі.** На яго думку, гэта дапаможа на першым этапе прадухіліць набыццё хатняга гадаванца тымі, хто ўспрымае яго як цацку. Маўляў той, хто хоча пагуляцца, моцна задумаецца, ці варта аўчынка вырабу, калі давядзецца рэгістраваць, чыпіраваць. «Калі не зрабіць гэтага, без належнага ўліку колькасць безнаглядных жывёл мы зменшыць не зможам», — перакананы С. Канопліч.

У тэксце дакумента, між іншым, хатніх гадаванцаў называюць жывёламі-кампаньёнамі. І наяўнасць такога кампаньёна накладае шэраг абавязкаў. Забяспечваць цішыню ў жылых памяшканнях, выгульваць сабак на павадку, у намордніку і толькі ў спецыяльна адведзеных для выгулу месцах, мець пры сабе сродкі для ўборкі спараженняў і, што важна, неадкладна праводзіць уборку. Вызначаюцца ўмовы ўтрымання, дапушчальная колькасць жывёл у жылых памяшканнях. Забараняецца ўтрымліваць жывёл-кампаньёнаў у пад'ездах, падвалах і паддашках, выгульваць іх у стане алкагольнага і наркатычнага ап'янення. Уводзіцца таксама забарона на знаходжанне жывёл-кампаньёнаў у крамах, школах, дзіцячых садках, арганізацыях аховы здароўя, на аб'ектах грамадскага харчавання і гэтак далей. Выключэнне робіцца толькі для сабак-павадыроў.

Праектам закона прадугледжана досыць адчувальнае пакаранне за ўмярцвенне жывёл — 40 базавых. Нават калі кацянят і перастануць тапіць, то наўрад ці кінуцца іх чыпіраваць (ці не даражэй выйдзе, даруйце за блюзнерства). А ці не азначае гэта, што колькасць беспрытульных жывёл павялічыцца?!

Законапраект разлічаны таксама на прадухіленне жорсткага абыходжання з жывёламі. Вылучаецца шэраг патрабаванняў. Некаторыя з іх выклікалі ў дэпутатаў непрыхаваную ўсмешку.

— Там ледзь не сэрца праслухаць трэба, вы калі-небудзь бачылі, як на фермах забіваюць свіней? — ставіць рытарычнае пытанне Уладзімір Кужанаў. — А вось гэта норма пра тое, што каня маладзей за пяць гадоў нельга выкарыстоўваць на цяжкіх работах... Што, пашпарты ўвядуць?

Пытанняў, насамрэч, безліч. Уявіць себе практычную рэалізацыю некаторых палажэнняў законапраекта, шчыра кажучы, няпроста. Але вернемся да таго, з чаго пачыналі: праблема ёсць, яна навідавоку. А значыць, любы крок у кірунку яе вырашэння — лепш, чым нічога. Да такой высновы, трэба думаць, прыйшлі і ўдзельнікі абмеркавання законапраекта ў Авальнай зале. Некаторыя нават выказалі падзяку распрацоўшчыкам. З 105 прысутных дэпутатаў толькі пяцёра прагаласавалі супраць, таму праект у першым чытанні прыняты. Ці зменяцца там нейкія практычныя нюансы да другога чытання, пакажа час.

ЗА НАМІ НЕ ЗАРЖАВЕЕ?

Урослыя шынамі ў асфальт, распісаныя мазнёй дваровай шпаны, пакарабачаныя, заржавелыя і перастаўленыя на цагліны — яны аддалена нагадваюць аўто. Але дзесяцігоддзямі цвёрда трымаюць свае пазіцыі на паркоўках. Ад абузы будуць вызваляцца арганізавана. Распрацаваны канкрэтны парадак прызнання машын безгаспадарнымі і перадачы іх ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі. Ён прапісаны ў папраўках да Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса, прынятых дэпутатамі ў першым чытанні.

Органам тэрытарыяльнага кіравання прадпісана ствараць адмысловыя камісіі, упаўнаважаныя складаць акты агляду безгаспадарных машын. Установяць асобу ўладальніка, дашлюць яму паведамленне. З машынай будзе прапанавана разабрацца на працягу 30 дзён: а раптам нехта палічыць за лепшае аплачваць стаянку, чым утылізаваць аўто? Па заканчэнні адведзенага тэрміну ў работу ўключаецца эвакуатар. Але нават і пасля гэтага ў распараджэнні гаспадара ёсць дадатковыя тры месяцы. Толькі праз гэты тэрмін лёс аўтамабільнага хламу зможа вызначыць суд. Прызнанне судом безгаспадарнасці машыны дае карт-бланш адпаведнай арганізацыі сістэмы ЖКГ. Але наўрад ці ім знойдзецца лепшае прымяненне, чым утылізацыя. Няўжо цесныя двары спальных раёнаў нарэшце будуць вызвалены ад аўтасмецця?!.

Ала МАЧАЛАВА.

Крымінал

Старшыня сельвыканкама ў махінацыях з зямельнымі ўчасткамі ўкраў больш за Br100 млн

Следчым аддзелам пракуратуры Мінскай вобласці завершана расследаванне крымінальнай справы па абвінавачанні старшыні аднаго з сельскіх выканкамаў Пухавіцкага раёна ў перавышэнні службовых паўнамоцтваў, крадзяжы грашовых сродкаў з выкарыстаннем службовых паўнамоцтваў, атрыманні хабару, махлярстве і службовым падлогу. Пра гэта паведаміла старшы памочнік пракурора Мінскай вобласці Таццяна Калініна.

Гэтай службовай асобе прад'яўлена абвінавачанне ва ўчыненні 115 эпізодаў злачынстваў. Асноўныя злачынствы — крадзяжы грашовых сродкаў, якія ўносіліся грамадзянамі ў якасці аплаты кадастравага кошту выдзеленых ім зямельных участкаў. Агульная сума скрадзеных грашовых сродкаў складае больш за Br100 млн. У перыяд з 2007 года па лістапад 2010 года абвінавачваны прыдумаў, на яго погляд, хітрую схему крадзяжоў — шляхам падробкі квітанцый аб аплаце грамадзянамі грашовых сродкаў, якія сам жа ён і выпісваў. Гэта значыць, у другі экзэмпляр квітанцыі ён уносіў сумы значна меншыя, чым фактычна атрымліваў ад грамадзян, а розніцу прысвойваў.

Акрамя таго, яму інкрымінуецца незаконнае выдзяленне грамадзянам чатырох зямельных участкаў і два эпізоды атрымання хабару за выдзяленне зямельных участкаў у суме $1,4 тыс. і $300.

Кар. БЕЛТА.

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество
«Акционерный сберегательный банк «Беларусбанк»
сообщает о проведении 11 января 2012 года
4-го тиража выигрышей по срочному банковскому вкладу в белорусских рублях «Шанс».

Перечень наименований товаров разыгрываемых в 4-м тираже выигрышей:
- печь СВЧ, изготовитель ОАО «Горизонт»;
- стиральная машина, изготовитель ЗАО «Атлант»;
- холодильник, изготовитель ЗАО «Атлант»;
- телевизор, изготовитель ОАО «Горизонт».

Информация о процентах, выплаченных по различным видам вкладов, депозитов в течение последнего финансового года с разбивкой по месяцам размещена на сайте www.belarusbank.by
Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў СНЕЖНІ

1, чацвер, 10.30 — 13.30
2, пятніца, 17.00 — 22.00
3, субота, 3.00 — 24.00
4, нядзеля, 0.00 — 1.30
6, аўторак, 10.00 — 13.30
9, пятніца, 1.00 — 2.00
11, нядзеля, 9.30 — 12.30
13, аўторак, 15.00 — 22.00
16, пятніца, 0.30 — 3.00
18, нядзеля, 1.30 — 7.00
20, аўторак, 9.00 — 11.00
22, чацвер, 9.00 — 11.00
24, субота, 10.30 — 13.00
26, панядзелак, 12.30 — 16.30
28, серада, 20.30 — 23.00
30, пятніца, 12.30 — 24.00
31, субота, 0.00 — 9.00

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.11.2011 г. (для б/н разлікаў)

▼ 1 долар ЗША	8 600,00	1 чэшская крона	446,50
▲ 1 еўра	11 480,00	1 польскі злоты	2 536,84
1 латвійскі лат	16 457,76	1 расійскі рубель	275,00
1 літоўскі літ	3 320,72	1 украінская грыўня	1 072,52

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	31,3216
10 UAH	39,0617
10000 BYR	36,2519
EUR	41,8457

Агентство Уладзіміра Грачова

Спорт-тайм

«ДЫНАМА» ДОМА ПАЧЫНАЕ З ПЕРАМОГІ

Фота БЕЛТА.

Хакеісты мінскага «Дынама» пачалі ў панядзелак трохматчавую хатнюю серыю ў чэмпіянаце Кантынентальнай хакейнай лігі з перамогі над ніжагародскім «Тарпеда» — 4:2 (1:1, 2:0, 1:1). Галы ў нашай каманды забівалі Дрозд, Мялешка, У. Дзянісаў і Іргл. З-за траўмаў па-ранейшаму па-за гульнёй вядучыя абаронцы «Дынама» Корабаў і Крайчэк. У «Тарпеда» таксама траўміраваны і не выходзіў на лёд галкіпер зборнай Беларусі Віталь Коваль. З 48 ачкамі пасля 28 матчаў мінскае «Дынама» займае 4-е месца ў Заходняй канферэнцыі.

ХАКЕЙНЫЯ ХАМЫ ДАГУЛЯЛІСЯ

Старшыня КХЛ Аляксандр Мядзведзеў падчас брыфінгу для журналістаў расказаў аб пакараннях, вынесеных удзельнікам суботніх беспарадкаў у Чэхаве. Па запыце Спартыўна-дысцыплінарнага камітэта КХЛ было вырашана «не выносіць пытанне аб зняцці «Віцязя» на разгляд савету дырэктараў клубаў КХЛ», паведаміў Мядзведзеў, дадаўшы, што «хамства на лёдзе ліга цярпець не будзе».

— Пачну з Яблонскі: у яго было дагэтуль 10 матчаў дыскваліфікацыі. За подлы ўдар Разанцава ззаду ліга прымае рашэнне дыскваліфікаваць Яблонскі да канца сезона. У Брэнана дыскваліфікацыя павялічана да 15 матчаў. На галоўнага трэнера «Віцязя» Андрэя Назарава накладзена самае вялікае грашовае спагнанне ў гісторыі КХЛ, але суму я называць не буду. Яблонскі і Брэнана таксама аштрафаваныя на сур'ёзныя сумы.

У БЕЛАРУСІ ДВА ЗАЛАТЫЯ МЕДАЛІ НА ЧЭМПІЯНАЦЕ СВЕТУ ПА КІКБОКСІНГУ

Беларуская спарсменка Вераніка Дамброўская ў ірландскім Дубліне заваявала два «золата» ў сольных кампазіцыях на чэмпіянаце свету па кікбоксінгу (версія WAKO). Вераніка стала лепшай у двух раздзелах — «мяккі стыль са зброяй» і «мяккі стыль без зброі». Яшчэ адна беларуска, Дар'я Машара, заняла 4-е месца ў раздзеле «мяккі стыль са зброяй».

ЗЯЗЮЛЬКІНА ДРУГІ ГОД ЗАПАР СТАЛА ЧЭМПІЁНКАЙ СВЕТУ ПА ШАХМАТАХ

Анастасія Зязюлькіна стала чэмпіёнкай свету сярод дзяўчат да 16 гадоў на чэмпіянаце свету ў бразільскім Калдас-Новасе, дзе змагаліся спартсмены ў катэгорыях ад 8 да 18 гадоў. Анастасія другі год запар стала пераможцай чэмпіянату свету. Летась яна выйграла аналагічны турнір у Грэцыі. У 2010 годзе юная мінчанка, стаўшы чэмпіёнкай Беларусі сярод жанчын, была прызнана лепшай шахматысткай краіны, апярэдзіўшы вядомага гросмайстра Ганну Шарэвіч.

Іван КУПАРВАС.

СЛОВЫ ЗНОЎ ДАРАЖЭЮЦЬ

На гэты раз для абанентаў СТАА «МТС». З 28 лістапада адзін з буйнейшых аператараў сотавай сувязі ў Беларусі падняў кошт шэрагу паслуг на многіх тарыфных планах.

Перагаворы не закрануў толькі сацыяльна арыентаваныя тарыфныя планы «Асаблівы» і «Блізкі. Для пенсіянераў». Таксама для ўжо заключаных дамоў не змяніліся памеры штомесячных плацяжоў па растэрміноўцы за абсталяванне.

Для іншых жа тарыфаў павялічыліся або абаненцкая плата, або кошт званкоў унутры сеткі (ад 10 да 30%, міжсеткавых і міжнародных злучэнняў, або роўмінг, кошт SMS-паведамленняў ці мабільнага доступу ў інтэрнэт (у сярэднім на 15-20%. «Усе без выключэння змены выкліканы аб'ектыўнымі эканамічнымі фактарамі, — адзначае кіраўніцтва кампаніі ў афіцыйным звароце. — У прыватнасці, павелічэнне кошту званкоў у роўмінгу звязана з тым, што разлікі са знешнімі партнёрамі вядуцца ў замежнай валюце. Праз павышэнне тарыфаў МТС імкнецца адысці ад бягучай стратнасці гэтага віду паслуг».

Адзначым, што МТС павышае расцэнкі ўжо ў другі раз за апошні год, між тым як канкурэнты рабілі гэта тройчы і больш разоў.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Кватэрнае пытанне

ДАПАМОГА МОЖА БЫЦЬ ПРАДУГЛЕДЖАНА. КАЛЕКТЫЎНЫМ ДАГАВОРАМ

НАША сям'я (двое непаўналетніх дзяцей) ужо больш за 10 гадоў жыве ў інтэрнаце для маласямейных. Ці маем мы нейкія льготы для паляпшэння жыллёвых умоў?

Г. ЦІХАНАЎ, *г. Мінск.*

Гэтае пытанне — у кампетэнцыі адміністрацыі, прафкама, працоўнага калектыву. У прыватнасці, дадатковыя ў параўнанні з дзейным заканадаўствам палажэнні не толькі аб умовах працы і яе аплаты, але і аб сацыяльным, жыллёва-бытавым забеспячэнні работнікаў (у тым ліку тых, што пражываюць у інтэрнатах), гарантыі і кампенсацыі, якія прадастаўляюцца наймальнікам, можна вызначыць пры распрацоўцы і прыняцці калектыўнага дагавора. Ім жа можна прадугледзець выдзяленне работнікам, якія стаяць на ўліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў аднаразовых бязвыплатных субсідый, пазык на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў, выдзяленне беспрацэнтных пазык, будматэрыялаў, машын, механізмаў індывідуальным забудоўшчыкам, членам жыллёва-будаўнічых кааператываў, а таксама работнікам, якія набываюць (выкупляюць) жыллё ва ўласнасць.

Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 кастрычніка 2010 г. № 538 «Аб некаторых пытаннях дзейнасці таварыстваў уласнікаў і арганізацый забудоўшчыкаў» (увайшоў у сілу з 1 студзеня 2011 г.), пры фарміраванні арганізацый забудоўшчыкаў (да іх аднесены жыллёва-будаўнічыя і жыллёвыя кааператывы) з ліку грамадзян, якія стаяць на ўліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы працы (службы) у дзяржаўным органе, іншай дзяржаўнай арганізацыі, у іх склад, акрамя прадугледжаных Указам ільготных катэгорый грамадзян, па-за чаргой могуць уключацца асобныя катэгорыі работнікаў, якія стаяць у гэтым органе, арганізацыі на ўліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, вызначаныя ў калектыўным дагаворы (пагадненні), а пры адсутнасці калектыўнага дагавора (пагаднення) — у рашэнні адміністрацыі дзяржаўнага органа, іншай дзяржаўнай арганізацыі і прафсаюзнага камітэта (пры яго наяўнасці). Спіс такіх асоб у абавязковым парадку ўзгадняецца з вышэйстаячым органам, арганізацыяй, а іх колькасць у арганізацыі забудоўшчыкаў, якая фарміруецца, не павінна перавышаць 20%.

Адпаведныя льготы прадугледжаны і пры долевым будаўніцтве шматкватэрных жылых дамоў.

Так, у адпаведнасці з п. 2 правілаў заключэнні, выкананні і скасаванні дагавора стварэння аб'екта долевага будаўніцтва (зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2006 г. № 396) мясцовы выканаўчы і распарадчы орган пры зацвярджэнні актаў выбару месца размяшчэння зямельных участкаў мае права вызначаць катэгорыю (катэгорыі) асоб, якім будзе аддавацца перавага пры заключэнні дагавораў.

Грамадзянам, якія адносяцца да такой катэгорыі (катэгорый), стаяць на ўліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў і зацікаўленыя ў будаўніцтве аб'ектаў долевага будаўніцтва, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы выдаюць накіраванні для заключэння дагавораў з забудоўшчыкам.

Пры гэтым не менш за 30% ад агульнай колькасці накіраванняў павінна прапаноўвацца грамадзянам, якія не маюць ва ўласнасці жылых памяшканняў у населеным пункце па месцы прыняцця на ўлік з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў (для г. Мінска — у г. Мінску і Мінскай вобласці) і ў тым ліку пражываюць у інтэрнатах (за выключэннем тых, хто ўсяліўся ў інтэрнат у сувязі з навучаннем, сезонных і часовых работнікаў), жылых памяшканнях прыватнага жыллёвага фонду па дагаворах найму жылога памяшкання або ў жылых памяшканнях дзяржаўнага жыллёвага фонду па дагаворах паднайму жылога памяшкання.

Віктар САВІЦКІ.

Розніца цэн на прадукты харчавання ў гандлёвых сетках Мінска дасягае больш як 70 працэнтаў

ЦЭНЫ на прадукты харчавання ў гандлёвых сетках моцна адрозніваюцца — у Мінску розніца дасягае больш як 70 працэнтаў. Аб гэтым заявіў учора ў час online-канферэнцыі на сайце БЕЛТА дырэктар Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Ігар Катляроў, перадае БЕЛТА.

Аналіз даных сацыялагічных маніторынгаў, якія штогод праводзяцца Інстытутам сацыялогіі, паказвае, што ў Беларусі цяпер адбываецца зніжэнне асноўных кампанентаў індэкса спажывецкага даверу. Як вынік, змяняюцца спажывецкія паводзіны насельніцтва. «Людзі пачынаюць задумвацца аб тым, што і як спажываць, а цэны на прадукты харчавання і тавары першай неабходнасці, а таксама кошт спажывецкага кошыка знаходзяцца на першых рангавых пазіцыях сярод праблем, якія хвалююць насельніцтва», — падкрэсліў Ігар Катляроў.

У сувязі з гэтым Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі ў лістападзе было праведзена даследаванне, прысвечанае вывучэнню і аналізу цэн на спажывецкія тавары ў сеткавых прадуктовых магазінах Мінска.

Як расказаў дырэктар Інстытута сацыялогіі, маніторынг цэн ажыццяўляўся па васьмі сеткавых магазінах «Алмі», «Бігз», «Вестэр», «Гіпа», «Еўраопт», «Прастор», «Рублёўскі», «Суседзі». «Цэнавыя замеры паказалі, што на тавары з харчовай групы цэны ў сетцы магазінаў «Еўраопт» значна ніжэйшыя, чым у іншых абследаваных магазінах», — заявіў Ігар Катляроў.

Ён удакладніў, што бягучыя расходы сям'і з чатырох чалавек на прадстаўлены харчовы спажывецкі кошык (у месяц) у магазінах сеткі «Еўраопт» склалі Br2 461 510, у іншых сетках — Br3 108 080. «Такім чынам, эканомія складае Br646 570, г.зн. сярэдні кошт харчовага спажывецкага кошыка ў сетцы «Еўраопт» на 26,3 працэнта таннейшы, чым у іншых сеткавых магазінах Мінска», — падкрэсліў Ігар Катляроў.

Дырэктар Інстытута сацыялогіі адзначыў, што розніца цэн па асобных групах тавараў дасягае значнай велічыні. Так, сярэдняя цэны «Еўраопта» ў параўнанні з сярэднімі цэнамі ў іншых магазінах ніжэйшыя ў сярэднім на 72,2 працэнта па кансервах з агародніны, на 69,9 працэнта — па відах аліўкавага і слабачнікавага алеяў, на 65,1 працэнта — па крупах, на 55,1 працэнта — па садавіне, на 54 працэнты — па каве і чаю, на 31,5 працэнта — па вінаградных вінах, на 40 працэнтаў — па марожанай рыбе, на 36,7 працэнта — па соках і нектарах.

Акрамя таго, сацыёлагі параўналі цэны на некаторыя тавары прамысловай групы, якія карыстаюцца найбольшым попытам у сетках гандлёвай розніцы. Як расказаў Ігар Катляроў, параўноўваліся цэны на тавары, папулярнасць якіх пацвярджаецца аб'ёмамі продажаў: пральныя парашкі, апалосквальнікі бялізны, зубныя шчоткі і пасты, туалетная папера, гігіенічныя пракладкі і дзіцячыя падгузкі. «Цэнавыя замеры па прамысловай групе тавараў паказалі, што цэны магазінаў сеткі «Еўраопт» у параўнанні з сярэднімі цэнамі ў іншых сетках ніжэйшыя ў сярэднім на 22,6 працэнта па пральных парашках, на 51,4 працэнта — па апалосквальніках для бялізны, на 59,9 працэнта — па шампуню, на 53,8 працэнта і 69,1 працэнта — па зубной пасце і зубных шчотках адпаведна. На 55,6 працэнта ў гэтай сетцы таннейшыя туалетная папера і папяровыя ручнікі, на 37,1 працэнта — жаночыя гігіенічныя пракладкі, на 55,9 працэнта — дзіцячыя падгузкі», — адзначыў галоўны сацыёлаг краіны.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што акрамя Br646 570 эканоміі бюджэту на прадуктах харчавання дадаткова сям'я можа зэканоміць яшчэ больш як Br180 тыс. на таварах прамысловай групы.

Пры аналізе цэн сацыёлагі спецыяльна бралі базавы кошт тавараў. Гэта значыць, яны не ўлічвалі цану тых тавараў, якія на момант маніторынгу былі на скідках ва ўсіх магазінах, дзе праводзілася даследаванне. Не ўлічваліся таксама цэны спецыяльных акцый і дысконтныя праграмы, прадстаўленыя ў магазінах.

НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ З... ГАРЭЛКАЙ

У Лідзе трапіў у аварыю веласіпедыст, які ў гэты момант трымаў у руцэ адкаркаваную пляшку гарэлкі, паведамляе Гродзенская абласная ДАІ. Гэта здарылася падчас перасячэння 34-гадовым мужчынам вуліцы Труханава, якая мае чатыры паласы руху. Ён пераадолеў дзве паласы і нават пазбегнуў сутыкнення з маршрутным аўтобусам, які ўбачыў веласіпедыста і рэзка прытармазіў. Аднак кіроўцы аўтамабіля «Рэно», які рухаўся злева ад аўтобуса, своечасова зарыентавацца не ўдалося. У выніку веласіпедыст з цяжкімі траўмамі дастаўлены ў рэанімацыю.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Абзац

◢ Следчым аддзелам пракуратуры Мінскай вобласці расследуецца крымінальная справа па факце забойства жыхара Уздзенскага раёна з-за калекцыі манет. Ноччу ў райаддзел міліцыі паступіла паведамленне аб пажары ў доме ў вёсцы Лоша. Пры тушэнні пажару ў хаце быў знойдзены труп мужчыны 1975 года нараджэння, сына гаспадара. Прычынай смерці з'явілася нажавое раненне ў сэрца. Пры правядзенні аператыўна-следчых мерапрыемстваў знойдзены падазроны ў здзяйсненні злачынства — 27-гадовы жыхар гэтай жа вёскі. Згодна з асноўнай версіяй следства, забойства здзейснена з-за калекцыі манет (усяго 2,5 тысячы) агульным коштам каля 40 тысяч доларaў. Абвінавачваны ўжо паказаў месца, дзе знаходзіліся скрадзеныя манеты. Яны канфіскаваны. Вядзецца следства.

◢ **Дзяржаўнае ўпраўленне па справах радыё, кіно і тэлебачання Кітая пастанавіла, што з 1 студзеня наступнага года тэлесерыялы будуць трансляваць без перапынкаў на рэкламу. Такое рашэнне было прынята, каб прыцягнуць аўдыторыю да прагляду фільмаў па тэлевізары. У апошні час кітайцы ўсё больш глядзяць любімыя фільмы і серыялы ў інтэрнэце. Большасць жыхароў КНР падтрымлівае ідэю, аднак спецыялісты сцвярджаюць, што новаўвядзенне можа пазбавіць дзяржаўную казну даходу ў некалькі мільярдаў юаняў у год.**

Поўны абзац

◢ Італьянскі святар дон Джорджа Пізана ў дворыку царквы ўпрыгожыў калядную ёлку штучнымі п'яўкамі. Справа ў тым, што п'яўкі сімвалізуюць такую з'яву, як пазыка грошай у рост. Такім чынам святар пратэстуе супраць засілля ліхвяроў. Дон Пізана з'яўляецца таксама супрацоўнікам мясцовага цэнтра па барацьбе з ліхвярствам. Па меркаванні святара, п'яўкі сімвалізуюць мафіёзі, якія, як і гэтыя брыдкія істоты, смокчуць кроў з людзей, робячы іх жыццё яшчэ больш складаным у разгар эканамічнага крызісу. Пізана мае намер развесіць мноства плакатаў з выявай сваёй ёлкі па ўсім горадзе. Подпіс пад плакатам такі: «Зрабі сабе падарунак на Каляды. Вызваліся ад крывасмоктаў, якія адабралі ў цябе нават навагоднюю ёлку. Звярніся ў цэнтр па барацьбе з ліхвярствам». Святар нагадаў, што ў цэнтры працуюць адвакаты, якія гатовы аказаць кваліфікаваную дапамогу ўсім, хто пацярпеў ад гэтай з'явы.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

95-гадовая выжыла на пажары

А яе дачка загінула.

Позна вечарам ў населеным пункце Бігосава Верхнядзвінскага раёна гарэў дом. Калі на месца здарэння прыбылі падраздзяленні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, ужо гарэў дах. 95-гадовая гаспадыня дома была выратавана суседзямі да прыбыцця пажарных. Яна пражывала сумесна з 65-гадовай дачкой, якая загінула.

Верагодная прычына пажару — неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні. Папярэдняя матэрыяльная страта, прычыненая пажарам, ацэнена ў пяць мільёнаў рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Начны падпал у парку адпачынку

Пра пажар у сталічным парку культуры і адпачынку імя 900-годдзя Мінска амаль у гадзіну ночы ў службу выратавання паведаміў мінак.

Работнікі МНС на месцы назіралі адкрытае гарэнне крытай гульнёвай пляцоўкі. Яна ўяўляла сабой металічнае збудаванне, якое не эксплуатавалася. Палалі пластыкавы дах на драўлянай абрашотцы і гумавае пакрыццё падлогі на плошчы 45 квадратных метраў. Яны былі знішчаныя цалкам. Прычына пажару — падпал. Вінаватая асоба зараз устанаўліваецца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мозырьдрев» (продавец)

извещает о проведении 30 декабря 2011 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование	Адрес объектов	Начальная цена продажи объектов, с учетом НДС, бел. руб.	Начальная цена продажи лота, с учетом НДС, бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб
1	Односторонний рейсмусовый станок МВ-160Н (инв. № 6720)	г. Мозырь, ул. Социалистическая, 120; г. Мозырь, ул. Гоголя, 61	13 405 200	43 654 800	4 000 000
	Вайма для сращивания минишипа инв. № 6731		1 876 800		
	Станок шлифовальный ШлПС-2М (инв. № 6019)		7 378 800		
	Станок фрезерный ФСШ-1 (инв. № 801)		7 392 000		
	Станок КОС 1-10 (инв. № 6729)		6 958 800		
	Устройство отсоса древесной стружки УОС-2 (инв. № 6072)		3 321 600		
	Устройство отсоса древесной стружки УОС-2 (инв. № 6073)		3 321 600		
2	Станок круглопильный легкий Ц-6 (инв. № 2253)		7 953 600	21 632 400	2 000 000
	Станок фуговальный СФ-4-1А (инв. № 6443)		13 678 800		
3	Станок ленточный MG-6500 (инв. № 6107)		72 816 000	102 096 000	10 000 000
	Станок заточной MG 225-50 С-3 (инв. № 6108)		24 672 000		
	Приспособление разводное (разводка зубьев ленточных пил) (инв. № 6109)		4 608 000		
4	Станок четырехсторонний продольно-фрезерный WT-516E, с вент. системой (инв. № 6104)		117 708 000	175 704 000	17 000 000
	Автопогрузчик вилочный, модель 40814 (инв. № 275)		10 956 000		
	Компрессор (инв. № 1759)		11 712 000		
	Станок токарный (предназначен для токарной обработки наружных и внутренних поверхностей деталей типа тел вращения разнообразного осевого профиля) (инв. № 95)		35 328 000		
5	Автопогрузчик ДВ-1792 (инв. № 28)		32 220 000	32 220 000	3 000 000
6	Автопогрузчик ДВ-1792 (инв. № 5048)		38 664 000	38 664 000	3 800 000
7	Автопогрузчик ДВ-1792 (инв. № 5934)		32 220 000	32 220 000	3 200 000
8	Погрузчик ковшовый, модель ТО-30 гос. № 5225 ГТ (инв. № 444)		22 380 000	22 380 000	2 200 000
9	Автомобиль ЗИЛ, модель 4502 гос. № ЕМ 5277 (инв. № 2797)		5 592 000	5 592 000	500 000

Продавец: Открытое акционерное общество «Мозырьдрев», 247760, г. Мозырь, ул. Социалистическая, 120. Решением хозяйственного суда Гомельской области от 01.11.2010 в отношении ОАО «Мозырьдрев» открыто ликвидационное производство.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (должника) (Открытое акционерное общество «Мозырьдрев») р/с 3012002731231 филиал № 317 ОАО «Беларусбанк» в г. Мозыре, МФО 151501678, УНП 400088836 **по 29 декабря 2011 года включительно.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения **по 29 декабря 2011 года включительно.**

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, Методическими рекомендациями об особенностях оценки и продажи имущества должника, находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) № 144 от 29.11.2010, в т.ч. Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232.

Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64 и на сайте gomeloblreklama.by

КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «СтанкоГомель» (продавец)

извещает о проведении 30 декабря 2011 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование	Адрес объектов	Начальная цена продажи объектов, с учетом НДС, бел. руб.	Начальная цена продажи лота, с учетом НДС, бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб.
1	Многофункциональное помещение (изолированное помещение) с инв. № 350/Д-195029, общ. площадью 24063,3 кв.м с железобетонным ограждением на ж/б опорах протяж. 310м (инв. № 2290), воротами металлическими (инв. № 2174), цистерной металлической (инв. № 601), цистерной металлической (инв. № 602), кладовой хранения запасных частей (инв. № 2040), кладовой хранения запасных частей (инв. № 2041), кладовой хранения запасных подставок для СМ1,5 (инв. № 2044)	г. Гомель, ул. Могилевская, 17/1	22 488 076 860 69 038 300 7 929 250 18 492 620 18 492 620 2 801 080 2 711 650 3 642 180	35 731 223 520	350 000 000
	Производственное помещение – изолированное помещение с инв. № 350/Д-196016, общ. площадью 1970,5 кв.м с очистными сооружениями методом коагуляции (инв. № 1845)	г. Гомель, ул. Могилевская, 17/3	777 939 120 349 508 880		
	Складское помещение – изолированное помещение с инв. № 350/Д-195031 общ. площадью 1433,0 кв.м.	г. Гомель, ул. Могилевская, 17/4	731 682 000		
	Производственное помещение – изолированное помещение с инв. № 350/Д-195026 общ. площадью 2581,8 кв.м.	г. Гомель, ул. Могилевская, 17/2	1 943 591 200		
	Здание цеха товаров народного потребления – капитальное строение с инв. № 350/С-75720 общ. площадью 5893,3 кв.м. с отстойниками различных типов (инв. № 805), градирней 2-секционной (инв. № 9998), открытым складом с козловым краном (инв. № 652), автодорогами и площадками на территории завода (инв. № 658), площадкой под ресиверы компрессорной (инв. № 2226)	г. Гомель, ул. Могилевская, 17	5 441 654 120 196 021 510 304 097 840 408 574 070 996 785 550 10 546 780		
	Здание неустановленного назначения (проходная) – капитальное строение с инв. № 350/С-79087 общ. площадью 30,0 кв.м		32 886 000		
	Сеть пароснабжения – наземно-подземные сети (капитальное строение с инв. № 350/С-116621) протяженностью 435,2 м		81 274 410		
	Линия электропередачи высокого напряжения – подземные сети (капитальное строение с инв. № 350/С-116609) протяженностью 1183,2 м		28 669 540		
	Линия электропередачи низкого напряжения – подземные сети (капитальное строение с инв. № 350/С-116611) протяженностью 466,1 м		7 161 340		
	Тепловая сеть – подземные сети (капитальное строение с инв. № 350/С-116619) протяженностью 274,1 м		119 511 000		
	Канализационная сеть – подземные сети (капитальное строение с инв. № 350/С-116616) протяженностью 1322,3 м		196 638 270		
	Тепловая сеть – наземно-подземные сети (инв. № 660) протяженностью 704,8 м		377 313 900		
	Канализационная сеть – подземные сети (капитальное строение с инв. № 350/С-116618) протяженностью 2048,0 м		631 867 640		
	Водопроводная сеть – подземные сети (капитальное строение с инв. № 350/С-116607) протяженностью 1111,2 м		482 687 060		
	Внеплощадочные сети связи – инв. № 659		1 628 730		

Продавец: Открытое акционерное общество «СтанкоГомель», ул. Интернациональная, 10, 246050, г. Гомель.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (Открытое акционерное общество «СтанкоГомель») р/с 3012111882016 в Региональной Дирекции № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Гомель, МФО 153001369, УНП 400085002 **по 29 декабря 2011 года включительно.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения **по 29 декабря 2011 года включительно.**

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона (имущество продается одним лотом) продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, в т.ч. Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232.

Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64 и на сайте gomeloblreklama.by

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

РАСІЯ РАЗГОРНЕ ЎДАРНУЮ ГРУПОЎКУ, КАЛІ ЯЕ ЗАКЛАПОЧАНАСЦІ ПА ПРА НЕ БУДУЦЬ ПАЧУТЫ

Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў заявіў, што калі сігналы Расіі на сітуацыю вакол ЕЎРАПРА не будуць пачуты заходнімі партнёрамі, то будуць прадпрыняты іншыя сродкі абароны, у тым ліку жорсткія меры процідзеяння і разгортванне ўдарных груповак.

«Калі наш сігнал не будзе пачуты, як я і сказаў 23 лістапада, мы будзем разгортваць іншыя сродкі абароны, уключаючы прыняцце жорсткіх мер процідзеяння і разгортванне ўдарнай групоўкі», — заявіў Мядзведзеў на нарадзе з Узброенымі сіламі РФ.

Нагадаем, 23 лістапада прэзідэнт Расіі даў даручэнне Мінабароны Расіі і Узброеным сілам увесці ў баявы склад радыёлакацыйную станцыю сістэмы папярэджання пра ракетны напад у Калінінградзе і ўзмацніць прыкрыццё аб'ектаў стратэгічных ядзерных сіл.

КІТАЙСКІМ СЕМ'ЯМ ДАЗВОЛІЛІ НАРАДЖАЦЬ ДРУГОЕ ДЗІЦЯ

Улады Кітая ўсумніліся ў эфектыўнасці палітыкі аднаго дзіцяці. Як паведамляюць інфармагенцтвы, напярэдадні ўлады адной з самых густанаселеных кітайскіх правінцый Хэнань, дзе пражываюць больш за 90 млн чалавек, часткова знялі забарону для мясцовых сем'яў на нараджэнне другога дзіцяці.

Праўда, мець жаданага другога спадчынніка дазволена не ўсім сем'ям. Паводле новага закона, нарадзіць хлопчыка можна будзе толькі тым бацькам, у якіх ужо нарадзілася дзяўчынка. А тым шлюбным парам, дзе муж і жонка былі адзінымі дзецьмі ў сям'і і ў іх не было родных братоў і сясцёр, дазволяць мець дваіх дзетак. Цікава, што ў свой час забарона на нараджэнне другога дзіцяці выратавала правінцыю ад з'яўлення на свет 33 млн немаўлят. Нягледзячы на гэта, насельніцтва Хэнань па-ранейшаму расце. Паводле прагнозаў, да 2020 года колькасць жыхароў рэгіёна дасягне 107 млн чалавек.

Спрэчкі з нагоды палітыкі аднаго дзіцяці не суціхаюць у Кітаі апошнія 30 гадоў. Некаторыя сцвярджаюць, што гэтыя нормы дапамагаюць скараціць рост насельніцтва і тым самым зберагчы рэсурсы. Паводле меркавання іншых, у выніку забароны на нараджэнне другога дзіцяці Кітай пакутуе з-за нераўнамерных суадносін палоў і перажывае недахоп працоўнай сілы. Ужо цяпер у Кітаі мужчын прыкладна на 15 млн больш, чым жанчын.

У ЗША ПАМЕРЛА ДАЧКА СТАЛІНА СВЯТЛАНА АЛІЛУЕВА

У ЗША пайшла з жыцця Святлана Алілуева, дачка Іосіфа Сталіна. Пра гэта паведамляе газета New York Times. Ёй было 85 гадоў.

Алілуева памерла яшчэ 22 лістапада ў горадзе Рычленд, штат Вісконсін, але ўлады штата паведамілі пра гэта толькі ў панядзелак. У апошнія гады жыцця Алілуева змагалася з ракам.

Алілуева нарадзілася ў сям'і Генеральнага сакратара ЦК ВКП(б) Іосіфа Сталіна і Надзеі Алілуевай у Ленінградзе 28 лютага 1926 года. Яна скончыла гістарычны факультэт МДУ і аспірантуру Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС. Працавала перакладчыкам з англійскай мовы і літаратурным рэдактарам. У 1967 годзе Святлана Алілуева, з'ехаўшы ў Індыю, адмовілася вяртацца ў СССР. Публікацыя кнігі «Дваццаць лістоў да сябра», у якой яна распавяла пра бацьку і крамлёўскае жыццё, выклікала сенсацыю ў свеце. У 1970 годзе Алілуева выйшла замуж за амерыканскага архітэктара Пітэрса, нарадзіла дачку, праз два гады развялася, але захавала за сабой імя Лана Пітэрс.

ВІТАМІН D РАТУЕ АД ДЫЯБЕТУ І РАННЯЙ СМЕРЦІ

Навукоўцы з Універсітэта Канзаса даказалі: людзі з паніжаным утрыманнем у арганізме вітаміна D пры прыёме дабавак з вітамінам больш як на 50% радзей паміралі. Прычым аналіз даных каля 10000 пацыентаў выявіў дэфіцыт вітаміну D прыкладна ў 70% выпадкаў. Гэтыя ж людзі знаходзіліся ў групе рызыкі развіцця сардэчных хвароб, піша The Vancouver Sun.

Таксама дэфіцыт вітаміну D павялічваў амаль у два разы верагоднасць ранняй смерці. А вось прыём вітамінаў змяншаў гэту рызыку на 60%. Паводле слоў прафесара кардыялогіі Джэймса Вацэка, ён не чакаў выявіць настолькі відавочную сувязь паміж сардэчнымі хваробамі і недахопам вітаміну. Такім чынам, дэфіцыт вітаміну фіксуецца, калі яго канцэнтрацыя складае менш чым 30 нанаграмаў на мілілітр крыві. У гэтым выпадку рызыка развіцця дыябету павялічваецца больш як у два разы, верагоднасць гіпертаніі — на 40% і больш, кардыяміпатыі — прыкладна на 30%. У цэлым жа ў гэтых людзей значна павышана рызыка смерці. А вось прыём дабавак скарачае рызыку смерці прыкладна на 60%. Джэймс Вацэк рэкамендуе штодня прымаць 1000-2000 адзінак вітаміну D, бо не заўсёды ёсць магчымасць пагрэцца на сонцы, ад уздзеяння якога ў целе выпрацоўваецца вітамін. Папоўніць яго недахоп таксама можна, дадаўшы ў рацыён тлустую рыбу, яйкі, малако.

На аснове матэрыялаў замежных СМІ падрыхтаваў Віталь ЯНКОЎ

На свае вочы

З НОЧЫ ДА НОЧЫ. І ШТО БАЧЫЛІ?

Купілі, прадалі — вось і ўвесь турызм

Фота Пятра ФАМІНА.

У СУВЯЗІ з нядаўнім рашэннем урада па абмежаванні вывазу з краіны аўтамабільнага паліва (выязджаць машынай за мяжу цяпер дазволена не часцей аднаго раза за 8 сутак, за выключэннем шэрагу ўважлівых прычын) прагназуецца стабілізацыя становішча ў памежных пунктах пропуску. Прасцей кажучы, чакаецца скарачэнне чэргаў у інтарэсах грамадзян, якія выязджаюць за мяжу ў турыстычных мэтах ці на адпачынак.

Калі-небудзь (можа, і ў зусім недалёкай будучыні), калі беларускія цэны на салярку будуць амаль такімі ж, як польскія ці літоўскія, на памежжы і сапраўды не будзе скаплення «рабочых конікаў» са сталітровымі бакамі. А будуць там (мо, дазвольце памарыць, ужо ў бязвізавых умовах?) сапраўдныя турысты. Дапусцім, нехта з гродзенцаў вырашыў азнаёміцца са славутасцямі суседняй Сувальшчыны, а хтосьці бярэ шлях далей, на Варшаву ці Кракаў. І тут жа, у зусім невялікай чарзе, разам з імі і польскія грамадзяне, якія вяртаюцца пасля паездкі ў Гродна, Навагрудак і Нясвіж.

Мо такая карцінка зусім і не фантастыка? Зрэшты, пакуль рэалій іншыя. Памежныя прыярытэты дыктуюцца не турызмам і адпачынкам, а камерцыйным інтарэсам, які звязаны з даволі істотнай розніцай паміж беларускімі цэнамі на аўтамабільнае паліва і цыгарэты і іх коштам у нашых суседзяў.

...Выязджаем у Беласток уначы, каля чатырох гадзін. У кіроўцы мікрааўтобуса дзве задачы: першая — даставіць чарговую партыю саляркі знаёмаму паляку, і другая — транспартная паслуга сваім пасажырам. Аўтар гэтых радкоў зацікаўлены ў набыцці камплекта зімовых шын на аўтамабіль, а сямейнай пары з Масквы, якая адпачывала ў сваіх гродзенскіх знаёмых, патрэбны пральная машына і шэраг іншых тавараў.

Наш кіроўца Віталь — зусім не гігант, так бы мовіць, паліўнага бізнэсу накшталт некаторых жыхароў Прынямоння, якія ўжо даўно паставілі гэту справу на шырокую нагу. Нават цэлыя «фірмы» стварылі, калі ва ўласнасці аднаго чалавека ці сям'і некалькі аўтамабіляў, якія спецыялізуюцца на штодзённым вывазе за мяжу саляркі, а заадно і яшчэ аднаго стратэгічнага тавару — цыгарэт. Гэта робяць па пэўных расцэнках наёмныя кіроўцы, але асноўны «навар» мае, зразумела, шэф, уладальнік транспартных сродкаў. А што? Гэта ж толькі апошнім часам дзяржаўныя органы заўважылі, што з гэтых даходаў не плацяцца падаткі. Зацікавіліся, адкуль у афіцыйна нідзе не працуючых асоб катэджы, па некалькі кватэр, новых машын. А раней, на працягу доўгіх гадоў, асаблівай увагі на гэты бізнэс не звярталі. Хіба што канстатавалася, як на адной нарадзе мытнікаў у Гродне, што некаторыя з «чаўнакоў» перасякаюць мяжу пяць разоў за суткі.

Зрэшты, з Віталем такога не здаралася, хоць і яму ўдалося набыць той жа мікрааўтобус найперш дзякуючы куплі-продажу машын, калі гэта было выгадна, ды і вывазу ў Польшчу саляркі.

...Мяжа, «Брузгі», чарга. Віталь «прафесійна» ацэньвае сітуацыю і вырашае, што ехаць у пункт пропуску «Прывалка», каб хутчэй трапіць у Беласток праз Літву, не варта. Мо і выйграеш у часе, але прайграеш ў затратах паліва на большы кіламетраж. Таму кірунак руху не мяняецца і прыкладна чатыры гадзіны пасажырам можна падрамаць у мікрааўтобусе. Зразумела, да таго часу, пакуль не пачынаецца кантроль памежнымі беларускімі, а затым і польскімі службамі. Канфліктаваць з імі не даводзілася, але склалася ўражанне, што гэтыя спецыялісты разбіраюцца не толькі ў пытаннях памежнага і мытнага рэжыму, але і ў псіхалагічных момантах. Ведаюць, з кім можна пажартаваць, а каго і спыніць для больш пільнага дагляду. Нядаўна, напрыклад, у адным з легкавікоў замест запаснога кола быў выяўлены ... дадатковы паліўны бак больш чым на 400 літраў саляркі.

Далей наш шлях ляжыць на Беластоцкі рэчавы рынак. Апошні раз тут даводзілася бываць гадоў пятнаццаць таму, і такое ўражанне, што час быццам спыніўся — тыя ж павільёны, палаткі і шмат гандлёвых «кропак» літаральна пад адкрытым небам. Тым не менш рынак не страціў сваёй прывабнасці, бо расіянам з нашага мікрааўтобуса спатрэбілася больш за тры гадзіны на свой шопінг. І тое, кажуць, не ўсю праграму выканалі.

А нашых землякоў-беларусаў не адзінкі, а дзясяткі. Прычым, мяркуючы па нумарах машын, яны не толькі з суседняй Гродзеншчыны, але і Брэсцкай, Мінскай і нават з іншых, больш аддаленых ад Беластока абласцей. І на легкавіках, і цэлымі кампаніямі на мікрааўтобусах, якія загружаюцца, так бы мовіць, пад самую завязку. Атавараваюцца, відавочна, не для ўласнага карыстання, цэлымі партыямі тых ці іншых рэчаў. Значыць, нават заплаціўшы за візу і транспарт, можна атрымаць выгаду ад рэалізацыі тавару.

Але як жа пры вяртанні дадому, на мяжы? Яўна ж далёка не ўсе гандляры ўкладуцца ў дазволеную норму ўвозу тавару. Віталь тлумачыць, што тут ужо даўно склалася схема, калі частка тавару на польскай тэрыторыі перадаецца (зразумела, не бясплатна) іншым перавозчыкам, і так ён трапляе ў Беларусь. Справа даволі рызыкоўная, здараецца нават, што памочнікі «кідаюць» сапраўдных уладальнікаў тавару, але такі варыянт працягвае выкарыстоўвацца.

Пасля рынку накіроўваемся ў адзін з беластоцкіх гіпермаркетаў, дзе масквічы маюць намер набыць пральную машыну. Чаму менавіта ў Польшчы, хоць тэхніка з такімі ж сусветнавядомымі брэндамі выпрабуецца і ў Расіі? Аказваецца, яны не давяраюць якасці айчыннай зборкі — хочацца еўрапейскай. Няглядзячы нават на тое, што ў дачыненні да набытага за мяжой тавару потым, на радзіме, будзе немагчыма прымяніць гарантыйныя абавязацельствы вытворцы. Няўжо зусім выключаны праблемы з якасцю?

Аднак і тавар еўрапейскай зборкі масквічам у Беластоку набыць не ўдаецца, бо няма пральнай машыны, якая б важыла не больш за 35 кілаграмаў. А інакш, з улікам мытнай пошліны, аўчынка вырабу не вартая.

Праўда, расіяне і тут не застаюцца без выгадных, на іх думку, пакупак — манітора для камп'ютара і электрафена. Пасля чаго мы бяром курс на Гродна, заязджаючы на гэтым шляху ў адну з вёсак, дзе нашага кіроўцу сустракае ягоны партнёр па «салярачным» бізнэсе. Віталь пакідае сабе столькі паліва, колькі трэба да Гродна, а асноўная частка, у тым ліку з каністры, перамяшчаецца ў тару паляка. Усім выгадна. Разлічваюцца і — да наступнай сустрэчы.

А час бяжыць імкліва, і хочацца хутчэй дадому, ведаючы, што яшчэ будзе чарга на мяжы. Але, як той казаў, паспяшыш... Паблізу аднаго з населеных пунктаў Віталь перавышае дазволеную хуткасць і, як часта здараецца ў падобных выпадках, менавіта там чакае кантроль — паліцыя. Віталь, зразумела, засмучаны (штраф «з'ядае» значную частку зароблených на салярцы «златувак»), але трымаецца годна.

Апошняй у гэтай паездцы была мэта аўтара гэтых радкоў — зімовыя шыны. У гэтым выпадку падтрымаць у Беларусі айчынных вытворцаў было проста немагчыма, бо такую «гуму» яны не вырабляюць. А ў Польшчы набываць гэты, як і іншы тавар, танней за кошт вяртання пакупнікам з краін, якія не ўваходзяць у Еўрасаюз, падатку — «ватаў». Праўда, рабіць бізнэс на шынах, як на салярцы, не атрымаецца, бо яны, як і камп'ютарны манітор расіян, былі на беларускай мытні задэклараваны. І калі раптам хтосьці з нас на працягу года захацеў бы зноў увезці гэты тавар, то атрымаецца толькі з выплатай пошліны. Бо ўжо не для асабістага карыстання. Як, напрыклад, у жыхара Гродна, які ў тым жа пункце пропуску «Брузгі», выбраўшы «зялёны канал», схаваў у асабістых рэчах 20 гульнявых прыставак на 40 мільёнаў рублёў.

...Чарга на выездзе з Польшчы займае ў нас яшчэ больш часу, чым пры ўездзе. Уначы выязджалі з дому, уначы і вяртаемся. Быццам і пры сваіх інтарэсах, але, па сутнасці, так і не ўбачыўшы польскага памежжа. Купілі, прадалі — вось і ўвесь турызм...

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Дзеля памяці

Сушкі ад Ефрасінні. І веды ад прафесара Бондаравай

Былыя вучні распавядалі пра сваю выкладчыцу тым, хто будзе вучыцца па яе падручніках

На адкрыцці імянной аўдыторыі ў гонар прафесара Бондаравай у Інстытуце журналістыкі БДУ было людна: вядомыя журналісты, выкладчыкі і прафесары, якія калісьці самі былі студэнтамі Ефрасінні Леанідаўны, а таксама цяперашнія студэнты слухалі гісторыі з яе жыцця.

Іх было шмат, самых розных, — ад пачатку, калі звычайная дзяўчына з вёскі Лёзненскага раёна паступіла на журфак у 50-м годзе, ужо паспытаўшы журналісцкай працы да таго моманту, калі сама стала выкладчыцай. Прычым з адметнымі метадамі, галоўным з якіх была любоў да студэнтаў, менавіта ў іх яна бачыла будучыню нашай дзяржавы. Нехта можа ўзгадаць яе насупленыя бровы, а нехта — той момант, калі на доўгіх занятках, з якіх не хацелася сыходзіць, прафесар падкормлівала студэнтаў сушкамі...

«Чалавек дзяржаўнага гучання», — казалі пра Бондараву. Яна дбала пра школу нацыянальнай журналістыкі, пра нацыянальную школу кінакрытыкі і беларускае кінамастацтва наогул, пра якое напісала шмат артыкулаў і даследаванняў, імкнучыся падтрымліваць сваіх, мясцовых творцаў — рэжысёраў, сцэнарыстаў, аператараў, акцёраў... А яшчэ яна перш за ўсё думала пра справу, а не пра асабістыя інтарэсы.

Доктар філалагічных навук, прафесар Ніна ФРАЛЬЦОВА (калісьці вучаніца Бондаравай):

— Яна была чалавекам вельмі неабыякавым. Магла напрамую звярнуцца да першага сакратара ЦК КПБ з пытаннем: калі ў факультэта журналістыкі будзе свой корпус? Ефрасіння Леанідаўна ўвесь час хацела, каб была самастойная кафедра, звязаная з выкладаннем мастацкіх дысцыплін, літаратурна-мастацкай крытыкай.

Яе мара здзейснілася тады, калі стаў моцным голас яе вучняў, якія прымалі гэтае рашэнне. Кафедра, натхнёная ідэяй Бондаравай, цяпер ушанавала прафесара, адкрыўшы аўдыторыю яе імені.

— Я думаю, што гэтая аўдыторыя будзе жыць сваім жыццём і сённяшнія студэнты будуць адкрываць для сябе імя гэтага чалавека, — падкрэсліла **загадчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Людміла САЯНКОВА**.

Тыя, хто не заспеў заняткі Бондаравай, могуць працягваць яе справу і вучыцца на яе публікацыях (яны сабраныя тут, у аўдыторыі), чытаючы яе кнігі, прысвечаныя беларускаму кіно, і падручнікі па журналістыцы. На паліцах размясціліся некаторыя яе рэчы. Аўдыторыю аглядаюць яе дасціпныя вочы: на сценах шмат фотаздымкаў, частку якіх перадалі муж — кінааператар Алег Аўдзееў і сын — кінакрытык Ігар Аўдзееў.

Дзве імянныя аўдыторыі (сёння ў іх праходзяць заняткі) у Інстытуце журналістыкі ўжо ёсць — у гонар прафесара Рыгора Булацкага і прафесара Барыса Стральцова. Іх памятаюць, чытаюць іх падручнікі.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ВІНАВАТЫ МОЦНА П'ЯНЫ. АЛЕ ЖЫВЫ

Кажуць, п'янаму — і мора па калена. Напэўна, нешта падобнае здарылася і ў Смалявічах.

Тут з палаючай кватэры выратавалі 42-гадовага мужчыну, які быў моцна п'яны. Мяркуецца, што ён і стаў — з-за неасцярожнасці пры курэнні — віноўнікам здарэння. Аднак сам нейкім цудам апёкаў не атрымаў.

Пра пажар у жылым доме стала вядома дзякуючы суседу. Дах чатырохкватэрнага жылля гарэў адкрытым полымем, калі апоўначы пажарныя прыехалі на вуліцу Зарэчную. Суседзі папярэдзілі, што ўнутры могуць быць людзі. Пацярпелага перадалі медыкам, але тыя ўстанавілі, што мужчына не мае патрэбы ў шпіталізацыі. З суседняй кватэры работнікі МНС эвакуявалі двух чалавек. У выніку пажару выгарала знутры кухня і прыбудаваная веранда, закураны былі сцены двухпакаёвай кватэры. Аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка ў доме не было.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СЯМЕЙНАЕ ЗАХАПЛЕННЕ?

Злодзея, які ўкраў каня з пашы ля вёскі Літвінавічы Кармянскага раёна ў канцы верасня, дагэтуль шукалі праваахоўнікі. Некалькі дзён таму ў міліцыю звярнуўся грамадзянін, які паведаміў, што бачыў жывёлу, падобную на апісаную, у жыхара вёскі Гадзілавічы Рагачоўскага раёна. Аператыўна-следчай групай сумесна з гаспадаром жывёлы было ўстаноўлена, што гэта менавіта той конь, які знік 3 месяцы таму.

Начальнік Кармянскага РАУС Віталь ЯНКОЎ адзначыў, што падчас аператыўна-следчых мерапрыемстваў быў знойдзены выкрадальнік — жыхар вёскі Чорная Вірня Жлобінскага раёна. Высветлілася, што ўкрадзеную жывёлу ў адной з вёсак суседняга раёна грамадзянін абмяняў на іншую, а тую прадаў у Расію. Дарэчы, мужчына быў раней асуджаны за аналагічнае злачынства: некалькі гадоў таму ён украў на Кармяншчыне ажно 5 коней. А ўпершыню яго злавілі за падобным заняткам яшчэ ў 1998 годзе — у Чавусах на Магілёўшчыне. Прынамсі, напярэдадні ў Жлобінскім раёне за крадзеж каня і двух жарабят быў затрыманы і сын падследнага.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЦІ КАШТУЕ ТАГО ТАЯ РЫБА?

Супрацоўнікі Бярэзінскага РАУС і Бярэзінскай міжрайінспекцыі на аўтадарозе райцэнтра спынілі аўтамабіль «Аўдзі-80», у якім ехалі тры мужчыны. Праверылі багажнік, а там — сапраўдны «арсенал».

Што ўбачылі міліцыянеры і дзяржінспектары? Электралавільнае ўстройства, акумулятар, гумавую лодку з вёсламі, пару рыбацкіх ботаў. У «дадатак» мех — са свежай рыбай. А ў салоне яшчэ і прыбор начнога бачання. Як было ўстаноўлена, мужчыны здабывалі рыбу гэтай забароненай прыладай лоўлі — электралавільным устройствам — на тэрыторыі раёна. А за гэта прадугледжана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да шасці гадоў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

РЫШТУНАК ДЛЯ БУДУЧЫХ АЛІМПІЙЦАЎ

СУЧАСНЫ спартыўны рыштунак выхаванцам аддзялення біятлона Жлобінскай раённай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы ўручылі дырэктар Беларускага клуба біятлона Алег Абызаў і старшыня Гомельскай абласной федэрацыі біятлона, начальнік УКДБ па Гомельскай вобласці Іван ЛЯСКОЎСКІ.

Зараз на базе дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы біятлонам займаецца 60 юных жыхароў Жлобіна. Прынамсі, налета ў горадзе чакаецца ўвядзенне другой чаргі лыжароллернай трасы. Першая была пабудавана дзякуючы фінансавай дапамозе Беларускага металургічнага завода. Пры ўручэнні юным біятланістам спартыўнага рыштунку, Іван Ляскоўскі пажадаў ім і трэнерам самаадданасці, цярпення, а таксама спартыўных перамог.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Падарунак ад Дзеда Мароза — па пошце

Днямі ва ўсіх паштовых аддзяленнях краіны распачаўся прыём заяў на атрыманне дзятвой паштовых віншаванняў ад Дзеда Мароза. Як паведамілі журналісту «Звязды» супрацоўнікі «Белпошты», сёлета такі паштовы падарунак уключае ў сябе навагодні ліст ад Дзеда Мароза, дзіцячую кніжку «Навагоднія прыгоды», альбом «Навагоднія цацкі-самаробкі», набор каляровай паперы для арыгамі «Арыгамагія» і набор фармавога мармеладу «Любімыя казкі». Усё пакладзена ў маляўнічы навагодні канверт.

Аформіць заказ на паслугу можна да канца снежня ў любым аддзяленні сувязі. Для беларускіх адрасатаў кошт паштовага падарунка складзе 23 200 рублёў. Разам з тым «Белпошта» прымае заказы на паштовы падарунак ад беларускага Дзеда Мароза і для замежных адрасатаў. Кошт паслугі будзе залежаць ад хуткасці дастаўкі карэспандэнцыі, паколькі ў перадсвяточныя дні нагрузка на пошту ва ўсіх краінах істотна ўзрастае. Калі вы не хочаце пераплачваць за тэрміновасць дастаўкі, то зрабіць заяўку трэба не пазней 15 снежня. У гэтым выпадку паштовы падарунак, які адправіцца ў далёкае ці блізкае замежжа, будзе каштаваць 57 490 рублёў. А калі кліент з заяўкай спазніцца, то за прыярытэтную (прасцей кажучы, тэрміновую) дастаўку давядзецца заплаціць ужо 68 340 рублёў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Минский районный исполнительный комитет 30 декабря 2011 года проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в Минском районе

		Лот 1	Лот 2	Лот 3
1	Адрес земельного участка	Минский район, Луговослободской с/с, д. Ефимово, участок № 65	Минский район, Луговослободской с/с, д. Ефимово, участок № 73	Минский район, Луговослободской с/с, д. Ефимово, участок № 74
2	Кадастровый номер	623684104101000223	623684104101000222	623684104101000221
3	Площадь земельного участка	0,1543 га	0,2110 га	0,2076 га
4	Срок аренды (лет)	99	99	99
5	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
6	Сумма убытков и потерь с/х производства (рублей)	-	-	-
7	Расходы по подготовке документации (рублей)	1 417 783	1 207 408	1 023 802
8	Начальная цена права заключения договора аренды	2 548,50 долларов США	3 484,98 долларов США	3 428,83 долларов США
9	Задаток (рублей)	2 200 000	3 000 000	2 900 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **30.12.2011 г. в 9.45.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **26.12.2011 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–3 перечисляется на расчетный счет № 3641900000075 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Карбышева, 13/2, код 520, УНП 600219251.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет при наличии согласия участника аукциона в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в аренду, в течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за предмет аукциона в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона принимает решение о предоставлении победителю аукциона земельного участка. Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка. Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, заключает с ним договор аренды земельного участка.

Пытальнік

ДАГАВОР ЗАКЛЮЧАНЫ. ТЭХНІЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ КАТЛА ВЫКАНАНА

Паважаная рэдакцыя! Прашу дапамагчы разабрацца ў нечаканай і сур'ёзнай праблеме, паколькі сама я з мінулага года з гэтым справіцца не змагла. Выкладаю сутнасць справы. Я набыла ў Оршы ў ІП газавы кацёл «Солпі-М». У верасні 2009 года «Орша ГАЗ» «пусціла» ў мой дом «блакітнае паліва». Згодна з інструкцыяй па карыстанні газавым катлом, трэба, каб перад кожным ацяпляльным сезонам яго аглядалі спецыялісты. Дык вось аказалася, што ў Оршы ні гаргаз, ні які іншы сэрвісны цэнтр чамусьці не займаюцца абслугоўваннем такіх катлоў. І я так і не пачула адказ: чаму прыбор павышанай рызыкі дазваляюць толькі прадаваць, а далей — праблемы спажыўца. Але я ж не купіла кацёл за мяжой. А ў Беларусь іх афіцыйна пастаўляе ТДА з Барысава. Вось там летась мне гарантавалі, што на прадпрыемстве «Орша ГАЗ» ёсць абучаныя спецыялісты. А ў Оршы мне даюць нумары тэлефонаў нейкіх добрых «спяцоў», але тыя «спяцы» не працуюць па дагаворы, а могуць аказаць разавую паслугу. Але ж гэта не гадзіннік ці камп'ютар, кацёл я не магу даверыць немаведама каму. Зыходзячы з вышэйвыкладзенага, прашу дапамагчы знайсці адказы на мае абгрунтаваныя пытанні. 1. Чаму ў Беларусі і ў Оршы ў прыватнасці гандлююць газавым абсталяваннем, якое потым няма каму абслугоўваць? 2. Чаму «Орша ГАЗ» перад газіфікацыяй майго дома не паставіла мяне ў вядомасць, што яны абслугоўваюць толькі катлы АОГВК і «Вулкан»? (Хоць гэта абсурд, мы ж жывём у XXI стагоддзі). 3. Хто вінаваты, што ў зіму я ўваходжу з няспраўным катлом?

Любоў Васільеўна БАРАНКЕВІЧ, *г. Орша.*

Каб знайсці адказы на пастаўленыя чытачкай шматлікія пытанні, рэдакцыя мусіла патурбаваць спецыялістаў з Оршы — з названага заяўніцай прадпрыемства, і з УП «Віцебскаблгаз». Забягаючы наперад, зазначым, што праблема жанчыны вырашана, у тым ліку найперш і дзякуючы аператыўнай працы работнікаў названых структур. Цяпер па сутнасці больш падрабязна, абапіраючыся на афіцыйнае рэагаванне з УП «Віцебскаблгаз».

«У адпаведнасці з дзейнымі ў Рэспубліцы Беларусь Правіламі карыстання газам у побыце, работы па тэхнічным абслугоўванні і бягучым рамонце газавага абсталявання ажыццяўляюцца спецыялістамі газазабяспечвальных арганізацый або іншых арганізацый, якія заключылі адпаведныя дагаворы з газазабяспечвальнымі арганізацыямі.

На сёння ў Рэспубліцы Беларусь рэалізуюцца газавыя ацяпляльныя апараты больш чым 50 гандлёвых марак, пры гэтым мадэльны рад катлоў налічвае больш за 500 мадыфікацый.

Упраўленне «Оршагаз» не мае магчымасці праводзіць тэхнічнае абслугоўванне і рамонт усяго спектра прадстаўленага на рынку абсталявання, у сувязі з чым намі ажыццяўляецца абслугоўванне ў першую чаргу катлоў айчыннай вытворчасці, а таксама найбольш распаўсюджаных у Аршанскім раёне гандлёвых марак, такіх як «Растоўгазаапарат», «Вулкан», «Лемакс» і іншых (для якіх ва ўпраўленні маецца адпаведны фонд запасных частак), якія добра зарэкамендавалі сябе па надзейнасці ў эксплуатацыі.

Катлы маркі «Solpi-M» упраўленне «Оршагаз» не абслугоўвае, у сувязі з чым грамадзянцы Баранкевіч Л.В. пры першапачатковай газіфікацыі яе домаўладання ў 2009 годзе было рэкамендавана звярнуцца ў іншыя арганізацыі, упаўнаважаныя выконваць гэты від работ. Такім чынам, грамадзянка Баранкевіч Л.В. заключыла дагавор на тэхнічнае абслугоўванне катла з ІП (г. Орша).

Разгледзеўшы і абмеркаваўшы з грамадзянкай Баранкевіч Л.В. пытанні, якія ўзніклі ў яе па абслугоўванні катла, кіраўніцтвам «Оршагаз» было прапанавана заяўніцы заключыць дагавор на тэхнічнае абслугоўванне катла з іншым сэрвісным цэнтрам, які маецца ў г. Орша, і ўпаўнаваным выконваць гэты від работ.

Зараз грамадзянкай Баранкевіч Л.В. заключаны дагавор на абслугоўванне ўсталяванага ў яе доме газавага катла з ІП. Неабходнае штогадовае тэхнічнае абслугоўванне катла выканана ім 15 лістапада».

Свая справа: з чаго пачаць?

ЁСЦЬ ІДЭЯ, АЛЕ НЯМА ГРОШАЙ? ДЫК ІНВЕСТАРА Ў ПАД'ЕЗДЗЕ АБО ЛІФЦЕ НЕ СУСТРЭНЕШ...

Калі вельмі чагосьці хочаш, то гэта абавязкова адбудзецца. І такі тэзіс на сваім вопыце даказаў Алег Кіцаненка, будаўнік з Брэста: ён вельмі хацеў пабудаваць завод па вытворчасці цэглы, і зараз яго мары пачынаюць увасабляцца ў рэальнасць — ён знайшоў інвестара, і сёння ў Віцебскай вобласці ўжо закуплена 8 тысяч квадратных метраў вытворчых плошчаў для арганізацыі гэтага прадпрыемства.

Пра тое, як рэалізаваць сваю мару і знайсці пад свой праект інвестара, Алег Кіцаненка расказваў удзельнікам Invest Weekend'а, які нядаўна прайшоў у Мінску. У прыватнасці, некалькі гадоў таму Алег Кіцаненка зацікавіўся вытворчасцю цаглін метадам гіперпрэсавання. Гэты метад, па яго словах, мае вялізны патэнцыял, але з-за недасканаласці абсталявання свайго развіцця не атрымаў. І толькі ў апошні час у свеце з'явілася абсталяванне, якое можна выкарыстоўваць для масавага выпуску такой цэглы. І вось Алег Кіцаненка вырашыў арганізаваць вытворчасць гіперпрэсаванай цэглы ў Беларусі:

— Я набыў сабе станок за тыя грошы, якія ў мяне былі: змог купіць толькі механічны прэс. Паспрабаваў працаваць і зразумеў, што не туды лезу. Зноў пачаў збіраць інфармацыю. Пасля выйшаў на інвестара з Брэста, пераканаў яго ў мэтазгоднасці вытворчасці і паехаў закупляць абсталяванне. Вытворчасць мы наладзілі, але гэта было прадпрыемства «на каленях» — як я называю, «гаражныя справы». Там усё было вельмі прымітыўна, хоць развівацца можна было і ў гэтым напрамку.

Сёння ў Алега Кіцаненкі дробнасерыйнай вытворчасці няма, бо ён вырашыў паспрабаваць наладзіць справу ў больш глабальным маштабе:

— Той вопыт мне дазволіў зразумець, што на ўзроўні, калі цагліны трэба рукамі здымаць, такія рэчы рабіць нельга. Гэта не дазваляе сябе рэалізаваць.

Тады Алег Кіцаненка паехаў у Мінск, дзе прэзентаваў свой праект на адным са Startup Weekend'аў. І яго ідэю заўважылі: пасля прэзентацыі падышоў Алег Глазуноў, саўладальнік сеткі будаўнічых крам «Ома», і прапанаваў супрацоўніцтва.

— Калі мяне пасля Стартап-уікэнда запрасіў Алег Глазуноў, то ён мне ўдзяліў 10 хвілін: «Вось табе два месяцы, складзі эканамічнае абгрунтаванне і дакажы мне ў лічбах усё тое, пра што расказваў». І я гэта зрабіў за два месяцы. Мае разлікі праверыў фінансіст «Ома», і ў яго нават атрымаўся лепшы вынік, бо я занізіў паказчыкі, — расказвае Алег Кіцаненка.

Далей падзеі развіваліся не вельмі хутка — інвестар пралічваў сабекошт і выдаткі, аналізаваў унутраны рынак краіны і рынкі суседніх краін, і толькі недзе месяц таму пачаліся больш актыўныя дзеянні. У прыватнасці, як паведаміў Алег Кіцаненка, ужо падпісана інвестдамова з Рэспублікай Беларусь і набыты вытворчыя плошчы ў Віцебскай вобласці. Дарэчы, сыравінай для вытворчасці павінен стаць даламіт — па разліках Алега Вітальевіча, яго ў Беларусі хапае. Пуск першай чаргі завода намечаны на верасень 2012 года, а ўсяго іх будзе дзве, а магчыма, калі з'явяцца новыя ідэі, і тры. Цікава, што прыдумана і назва для будучага завода:

— Называцца ён будзе «Кубел» — гэта скарачэнне ад «Купляйце беларускае!». Я лічу, што гэта вельмі ўдалы лозунг, і мы з ім зможам паспяхова гандляваць і ў Расіі, і ва Украіне. А тое, што гэта будзе сапраўды класны матэрыял, то паверце мне: нам не будзе сорамна за сваю вытворчасць, бо мы збіраемся зрабіць завод сусветнага ўзроўню — такіх заводаў у свеце штук 9, прычым у СНД няма ніводнага.

«БУДУ СУЗАСНАВАЛЬНІКАМ, КАЛІ ПАШАНЦУЕ»

Сёння Алег Кіцаненка працуе ў фірме «Ома» і з'яўляецца кіраўніком праекта па стварэнні цагельні, але ён спадзяецца ў хуткім часе стаць дырэктарам гэтай вытворчасці, а, магчыма, і сузаснавальнікам.

— Ці буду я сузаснавальнікам? — Алег Вітальевіч задумваецца над пытаннем з залы. — Калі пашанцуе, то буду. Ведаеце, цяжка нешта патрабаваць, не маючы ўласных сродкаў. Калі б у мяне былі грошы, то было б нашмат прасцей — уклаў сваю долю і спакойна працуй. А так, па-сутнасці, я зараз нічым не рызыкую, а інвестар — сваімі грашыма... Але я ўпэўнены, што інвестар выканае ўсе свае абавязацельствы і зробіць тое, што абяцаў — у нас ёсць вусныя дамоўленасці.

З вышыні свайго вопыту рэалізацыі праекта і стасункаў з інвестарамі Алег Кіцаненка падзяліўся з прысутнымі некаторымі сакрэтамі. Самае галоўнае, лічыць ён, — гэта верыць у сваю ідэю і падабраць добрую каманду:

— Вы павінны ведаць, што грошы ў бізнэсе граюць далёка не першую ролю. На першае месца я б паставіў тых людзей, з якімі ты збіраешся рабіць бізнэс. Другое месца — гэта ваша ідэя. І толькі на трэцім месцы — грошы, — сказаў ён і дадаў, што таксама варта запасціся цярпеннем, бо не адзін раз будуць моманты, калі захочацца апусціць рукі і адмовіцца ад рэалізацыі праекта. — Інвестар падобны на капрызлівае дзіця, яму ўсё не падабаецца. Таму трэба мець цярпенне, трэба даказваць, і, галоўнае, самому верыць у тое, што вы хочаце прапанаваць. Я не лічу, што мне пашанцавала. Шанцаванне — гэта вынік мерапрыемстваў, якія ты робіш, каб апынуцца ў патрэбны час і ў патрэбным месцы. Калі ты нічога рабіць не будзеш, то табе наўрад ці пашанцуе. Дарэчы, я чалавек сямейны, і, магчыма, менавіта дзякуючы маёй сям'і, іх падтрымцы, я і пражыў гэты час. Бо былі моманты, калі знікала жаданне нешта рабіць, былі такія моманты, калі інвестар разы тры казаў, што закрывае праект... Але потым гэтыя праблемы нейкім чынам вырашаліся. Таму не трэба адчайвацца, а трэба шукаць выйсце са складаных сітуацый.

Таксама Алег Кіцаненка раіць трымаць дыстанцыю паміж сабой і інвестарам:

— Трэба разумець, што ў інвестара ёсць свае справы, а вы — адзін з многіх, хто хоча прыйсці і забраць яго грошы. Але як толькі вы перастуліце тую мяжу, калі інвестар зразумее, што вы не хочаце выманіць у яго грошы, а хочаце даць магчымасць яшчэ больш іх зарабіць (ну і, вядома, самім трошкі падзарабіць) — вось тады ўжо пойдзе пэўны прагрэсіўны працэс.

Напрыканцы свайго выступлення будучы дырэктар цагельнага завода падзякаваў арганізатарам Стартап-Уікэндаў за стварэнне такой пляцоўкі, дзе могуць сустрэцца ініцыятыўныя людзі і інвестары. Бо, па словах Алега Кіцаненкі, інвестара цяжка сустрэць у звычайным жыцці — у метро, ліфце або пад'ездзе.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Прамая лінія

«ТО ЛЕДЗЬ-ЛЕДЗЬ ГРЭЕ, ТО ЗУСІМ НЕ ГРЭЕ...»

Так ахарактарызавала якасць работы цэнтральнага ацяплення ў сваім доме *Кацярына Васільеўна з Радашковічаў*, дазваніўшыся на гарачую тэлефонную лінію, якую ў панядзелак правёў старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Барыс БАТУРА.

Жыхары 3-павярховага жылога дома ўжо з дзясятак гадоў церпяць холад у сваіх кватэрах.

— У маёй спальні ў «гармоніку» батарэі толькі дзве «рабрынкі» грэюцца, — прызналася жанчына. Таму нават у параўнальна цёплае восеньскае надвор'е, пры плюсавых тэмпературах, у пакоі холадна. Жыльцы звярталіся і ў ЖКГ, і ў раённы выканкам, але галоўная праблема ў тым, што будынак не камунальны, а на балансе мясцовага прафілакторыя. Нягледзячы на гэта, праблему вырашаць трэба, людзей на зіму ў холадзе пакідаць нельга. Старшыня Мінаблвыканкама паабяцаў высветліць сітуацыю і па магчымасці дапамагчы.

На халодныя батарэі ў сваім доме наракала, дазваніўшыся, і ***Вольга Іванаўна з пасёлка Калодзішчы Мінскага раёна***. Па яе словах, без электраабагравальнікаў у яе кватэры ўвогуле немагчыма абыходзіцца. А ў сям'і — маленькае дзіця, якое з-за холаду пастаянна хварэе. Яшчэ ў лістападзе мінулага года жанчына звярталася ў домаўпраўленне, дзе ёй паабяцалі, што вясной усё зробяць. Прайшла вясна. За ёй і лета. Вольга Іванаўна яшчэ неаднойчы дасылала лісты ў службу ЖКГ, як раённую, так і абласную. Ёй паабяцалі да наступлення ацяпляльнага сезона ўсё выканаць. Напярэдадні падключэння сістэму прамылі, але цяплей у кватэры не стала... Па словах жанчыны, у суседнім доме, дзе месяцца само домаўпраўленне, усталявана спецыяльная помпа, дзякуючы чаму ў доме сістэма ацяплення працуе выдатна. Калі помпу адключылі, стала цёпла і ў доме скаржніцы. Тады было прынята «саламонава рашэнне»: днём помпа працуе, дзякуючы чаму добра грэецца дом, дзе месяцца домаўпраўленнне, а на ноч адключаецца, каб пагрэцца маглі і Вольга Іванаўна з суседзямі. Атрымліваецца, што жыльцам абодвух домаў палову сутак холадна. «Гэта ж не выйсце!» — абурылася Вольга Іванаўна. З ёй пагадзіўся і Барыс Васільевіч, які паабяцаў разабрацца ў сітуацыі.

Увогуле, пытанняў па рабоце жыллёва-камунальных службаў, якія жыхары Міншчыны, карыстаючыся выпадкам, агучвалі Барысу Батуры, было традыцыйна шмат. У аднаго — сцены цякуць, бо ЖКГ не можа якасна перакрыць дах, у другога прасеў да зямлі фундамент, перакасіліся дзверы і вокны, бо за сваю больш чым 100-гадовую гісторыю дом ні разу не бачыў капрамонту і г.д. У Калодзішчах — перабоі з вадой, у Калядзічах — праблемы з вулічным асвятленнем...

Дзмітрый Паўлавіч з вёскі Селішча Слуцкага раёна зноў узняў праблему забеспячэння свайго населенага пункта вадой. Зноў — бо праблему ўжо агучвалі падчас папярэдняй прамой лініі, і старшыня Мінаблвыканкама тады даў даручэнне вырашыць пытанне. Справа ў тым, што ўся вёска сілкуецца ад адной воданапорнай вежы, у якой з-за яе значнага ўзросту зменшыўся ціск вады. Адпаведна вада ў хаты паступае з перабоямі. Раён паабяцаў паставіць туды дадатковую помпу, але пакуль што далей размоў справа не зрушылася...

Галіна Іванаўна са Слуцка папрасіла Барыса Васільевіча вярнуць зніжкі на карыстанне гарадской лазняй, якія раней у іх існавалі для шэрагу льготных катэгорый. Сама Галіна Іванаўна жыве ў прыватным сектары і як інвалід II групы таксама карысталася гарадской лазняй на льготных умовах. Цяпер ільготу забралі (адпаведнае рашэнне было прынята райвыканкамам з-за таго, што ў ЖКГ не хапае сродкаў на ўтрыманне лазні).

— Мы цяпер хочам сістэмна падысці да гэтага пытання, — патлумачыў жанчыне Барыс Батура. — Будзем выпускаць спецыяльную «сацыяльную картку», якую выдадзім тым, хто мае права на пэўныя льготы і зніжкі. Гэта тычыцца і гандлю, і сферы абслугоўвання.

Ларыса Міхайлаўна з Калодзішчаў агучыла занепакоенасць усіх вясковых жыхароў, хто мае агарод, свойскую жывёлу і птушку, пасля ўвядзення нормы расходу вады на чалавека.

— Норма аднолькавая, незалежна ад таго, гарадская гэта кватэра ці прыватны дом, дзе ёсць прысядзібны ўчастак і жывёла, птушка, — патлумачыла прычыну сваіх турбот жанчына. — Зразумела, што ў прыватным доме расход вады будзе большым. І плаціць за ваду прыйдзецца даражэй. Атрымліваецца, што на вёсцы не трэба мець ні свойскай жывёлы, ні прысядзібнага ўчастка?..

Ларыса Міхайлаўна прапанавала ўвесці нейкую норму расходу вадаправоднай вады на жывёлу і свойскую птушку для вяскоўцаў. Старшыня Мінаблвыканкама паабяцаў унесці адпаведную прапанову на разгляд Савета Міністраў.

Літаральна кожнае другое пытанне, агучанае падчас прамой тэлефоннай лініі, тычылася жыллёвага будаўніцтва. Што цалкам зразумела: людзі ўступілі ў кааператывы, «увязаліся» ў крэдыты і цяпер хвалююцца за будучыню сваіх «квадратных метраў» і за іх кошт. Многія дамы, якія на пачатку будаўніцтва планаваліся да здачы сёлета, па розных прычынах будуць здавацца пазней (замест запланаваных 1 млн 350 тыс. у вобласці сёлета будзе ўзведзена каля 1 млн 100 тыс. квадратных метраў). Барысу Васільевічу неаднойчы падчас прамой лініі давялося тлумачыць, што цяпер з дзяржбюджэту фінансуюцца толькі дамы, якія будуць уведзены да канца года. Астатніх, хто распачаў будаўніцтва, пачнуць фінансаваць са студзеня 2012 года.

Можна смела канстатаваць, што пераважная большасць праблем, з якімі звярнуліся жыхары Міншчыны да старшыні Мінаблвыканкама на прамой лініі, маглі б быць вырашаны на мясцовым узроўні. Часам грамадзяне не знаходзяць паразумення і падтрымкі з боку нізавых чыноўнікаў, а часам — па-ранейшаму спадзяюцца толькі на «вярхі». І тады старшыні аблвыканкама не давядзецца асабіста займацца пытаннем устаноўкі дарожнага знака, які абмяжоўвае ўезд на дворавую тэрыторыю грузавога транспарту ў горадзе А., кантраляваць падключэнне помпы да старой воданапорнай вежы ў вёсцы В., і якасць рамонту сістэмы цэнтральнага ацяплення ў канкрэтным доме ў аграгарадку С.

Інга МІНДАЛЁВА.

Жыхар Гродна спалучыў лячэнне ў бальніцы са збытам фальшывых долараў

Міліцыя затрымала «валютчыка» з фальшывымі доларамі, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе УУС Гродзенскага аблвыканкама.

Раней судзімы 39-гадовы гродзенец сумясціў курс лячэння ў бальніцы са спробай павысіць свой дабрабыт. У перапынках паміж працэдурамі пацыент пераапранаўся, надзяваў фальшывыя пярсцёнкі і ланцужкі, браў барсетку, што, на яго думку, рабіла яго падобным да тыповага валютчыка. У такім вобразе каля абменных пунктаў ён угаворваў людзей (у асноўным моладзь, студэнтаў або пенсіянераў) абмяняць валюту па больш выгадным курсе. Ён браў долары і па прычыне хавання ад міліцыі адыходзіў за грашыма да сябра, які нібыта чакаў яго ў зацішным месцы непадалёк. Хутка вяртаўся і аддаваў замежныя грашовыя банкноты, тлумачачы, што міліцыя ўсё ж такі не дала магчымасці ажыццявіць здзелку ў гэты момант. Грамадзяне выяўлялі ашуканства пры спробе здаць фальшывыя банкноты ў абменнік. За некалькі дзён міліцыі стала вядома аб чатырох пацярпелых ад махляра. У яго было знойдзена звыш дзясятка сувенірных купюр найбольш хадавога наміналу ў $50, $100 і 50 еўра.

КАШТОЎНЫЯ МЕТАЛЫ Ў ЧАРГОВЫ РАЗ «ПАЦЯЖЭЛІ»

Пастановай Міністэрства фінансаў зацверджаны новыя цэны на каштоўныя металы ў вырабах і ломе, што скупліваюцца ў фізічных асоб (акрамя купліпродажу банкаўскімі і нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі каштоўных металаў у выглядзе мерных зліткаў і манет у фізічных асоб) і пастаўляюцца ў Дзяржфонд. У сілу яны ўступаюць з 1 снежня. Звяртае на сябе ўвагу той непрацяглы тэрмін, які пратрымаліся ранейшыя цэны — яны ўступілі ў сілу з 3 лістапада. Дагэтуль на працягу года цэны на каштоўныя металы мяняліся з 15 верасня, з 20 чэрвеня, з 1 красавіка. Перад тым — з 1 лістапада 2010 года.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Такім чынам, з вышэйназванай даты будуць дзейнічаць наступныя скупачныя цэны на каштоўныя металы ў вырабах і ломе за адзін грам металу па пробах. Золата: 375-пробы — 153 130 рублёў (дагэтуль дзейнічала скупачная цана ў памеры 121 350 рублёў); 500-й пробы — 204 170 рублёў (161 790 рублёў); 583-й і 585-й пробы — 238 880 рублёў (189 300 рублёў); 750-й пробы — 306 250 рублёў (242 690 рублёў); 900-й пробы — 367 510 рублёў (291 230 рублёў); 916-й пробы — 374 040 рублёў (296 410 рублёў); 950-й пробы — 387 920 рублёў (307 410 рублёў); 958-й пробы — 391 190 рублёў за адзін грам металу (дагэтуль было 310 000 рублёў).

Плаціна ў вырабах і ломе з 1 снежня будзе скупляцца па наступных цэнах: 950-й пробы 358 090 рублёў за адзін грам металу (было да нядаўняга 284 220 рублёў за той жа грам). Скупачныя цэны на серабро ў вырабах і ломе з пачаткам першага зімовага месяца будуць выглядаць так. За адзін грам металу дадуць: 750-й пробы — 5 860 рублёў (ранейшая скупачная цана — 4 650 рублёў); 800-й пробы — 6 250 рублёў (4 960 рублёў); 875-й пробы — 6 840 рублёў (5 430 рублёў); 916-й пробы — 7 160 рублёў (5 680 рублёў); 925-й пробы — 7 230 рублёў (5 740 рублёў); 960-й пробы — 7 500 рублёў за адзін грам металу (дагэтуль было 5 960 рублёў).

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Па метал унутр бетонамяшалкі

Каб трапіць унутр бетоннай установкі, якая знаходзіцца на тэрыторыі Чачэрскай ПМК-118, жыхар Чачэрска пералез цераз плот, а потым — цераз праём паміж зямельным пакрыццём і сценкай. І ўсё для таго, каб зняць з машыны 3 вібратары.

Непрацуючы паспеў рэалізаваць здабычу, якая каштуе амаль Br2 млн. рублёў. А вось 20-гадовы гамяльчанін спецыялізаваўся на кабелях дымавыдалення і пажаратушэння. Іх ён выцягнуў з двух пад'ездаў дома на адной з цэнтральных вуліц Гомеля. Нанесеная шкода складае амаль Br 4 млн рублёў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Злодзей побач

У беспрацоўнага з в. Аніскавічы (Кобрынскі раён) з гаспадарчай прыбудовы нехта ўкраў 400 кг збожжа. Калі аператыўнікі пачалі шукаць злодзея, то падазрэнне ўпала на стрыечнага брата, які жыў у адной хаце з пацярпелым.

45-гадовага мужчыну напэўна чакае суд, які раней яго ўжо асуджваў за кражу.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
по продаже объекта республиканской собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

Лот № 1. Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	**Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, расположенное по адресу: г. Гродно, просп. Космонавтов, д. 60в и право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,8121 га сроком на 50 лет**
	Начальная цена предмета аукциона – 1 779 233 729 руб., сумма задатка – 177 923 000 руб.
	Продавец недвижимого имущества: Производственное республиканское унитарное предприятие «Гродноэнергосбережение», контактные телефоны (8 0152) 77 28 93, 73 05 27
Организатор аукциона: Гродненский областной территориальный фонд государственного имущества (фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней), тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82; **www.region.grodno.by, www.gki.gov.by**	

1. Аукцион состоится **14 декабря 2011 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами принимаются Организатором аукциона **по 9 декабря 2011 года до 13.00**, кабинет 6.

Сумма задатка перечисляется на расчетный счет Организатора аукциона – фонда «Гроднооблимущество» №3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549.

3. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить фактические затраты на организацию и проведение аукциона согласно утвержденным сметам, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков.

4. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке, в соответствии с условиями аукциона, Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

5. **Подробная информация** – в извещении о проведении аукциона, ранее опубликованном в газете **«Звязда» 25 октября 2011 г. № 203 (27067).**

Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БА № 0138574, серии СО № 0001127, 0001399, формы 2РН серии ПТ № 0536221, 0536443, 0536698, 0537640, 0537852, 0537955, 0537961, по гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВС №№ 4785986, 4785987, 4785988, № 4874039, квитанции формы 1-СУ серии КС №№ 1011259, 1007039, по обязательному страхованию ответственности владельцев транспортных средств, выезжающих в страны системы «Зеленая карта», формы BY/07 №№ 5859416, 5859424, 5247961, 6007862, 6007864, 5882059 **считать недействительными**. УНП 100357923

Утерянный представительством Белгосстраха по Первомайскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию наземных транспортных средств формы 2РН-РП серии ТС № 0148064 **считать недействительным**. УНП 101883943

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА


Пара белых галубоў, якіх пускаюць у неба шчаслівыя маладыя, стала для клімавіцкіх вясельляў не арыгінальнай адметнасцю, а прыгожай традыцыяй. Мясцовы галубятнік Мікалай Сцяпанавіч Воранаў гатовы забяспечыць сімваламі кахання ўсіх, хто пажадае. Тым больш што некаторыя з белых галубоў пасля вясельнай дзеі вяртаюцца дадому.

Дадому — гэта на вуліцу Рачную ў раённым цэнтры Клімавічы. На падворку на гарышчы хлява жывуць некалькі дзясяткаў галубоў. Яны самых розных парод і колераў. Найбольш белых і цёплага карычневага колеру, а з парод гаспадар аддае перавагу курскім, якія «лунаюць у паветры, нібы матылі», а таксама белым мікалаеўскім, якія высакародна выглядаюць на вяселлях.

— Галубы — маё хобі, з дзяцінства і да скону жыцця, — усміхаецца шчаслівы 55-гадовы галубятнік. — Хто заводзіць рыбак, хто сабаку ці ката, а я люблю галубоў.

Залезці на галубятню па жалезнай лесвіцы, якая здаецца, хістаецца ў паветры, даволі складана. Але (калі забегчы наперад) спусціцца — увогуле подзвіг, тым больш для гараджанкі ў мадэльным абутку і з фотаапаратам у руках. Але ж цікава паглядзець на галубятню!

Дарэчы, фатаграфаваць птушак, якія нервуюцца пры чужых, няспынна буркуюць і лопаюць крыламі, даволі складана. Гаспадар акуратна лоўіць пару, трымае птушак у руках. Моцна, але з пяшчотай.

— З галубамі добра адпачываць, — расказвае мужчына. — Калі прыходжу стомлены з працы, магу гадзіну-другую сядзець і проста глядзець на птушак. І больш ні пра што не думаць. Жонка цікавіцца, што я раблю на галубятні. А я проста адпачываю ад жыццёвай мітусні. Мне з галубамі цікава і добра.

Мікалай родам з Адэсы, дзе шмат аматараў галубоў. Апынуўся ён у раённым цэнтры на беларуска-расійскім памежжы выпадкова: прыехаў у госці да сястры ў воінскую часць. Сястра з'ехала дадому, а ён застаўся там, дзе знайшоў сваю другую палову. Мікалай па прафесіі зваршчык, але цяпер працуе вартаўніком і мае час на птушак.

Ён тлумачыць, што галубы не патрабуюць вялікага догляду: трэба карміць птушак і чысціць галубятню. Добрым кормам для галубоў з'яўляюцца зерневыя сумесі, з ячменем і кукурузай. Воранаў да халоднага сезона падрыхтаваўся: у цяпліцы вісяць мяхі з ярка-жоўтымі кукурузнымі пачаткамі. Зерне вымерзне і высахне, будзе выдатным кормам.

Важна сачыць, раіць галубятнік, каб не было скразнякоў. Але больш, чым любыя хваробы, цяпер галубам небяспечныя драпежныя птушкі. Нягледзячы на прыгожы сонечны дзень, Мікалай адмаўляецца выпусціць на волю сваіх гадаванцаў. Ён асцерагаецца, што дэманстрацыя палётаў можа дрэнна скончыцца:

— Ястрабы б'юць моцна. У наваколлі пахавалі вёскі, якія пацярпелі ад чарнобыльскай радыяцыі, і ястрабаў стала зашмат. Але і людзі часам збіваюць галубоў аўтамабілямі. Гараджане не вельмі любяць гэтых птушак і кажуць, што яны толькі гадзяць. Але яны не шкодныя, добрыя і вельмі прыгожыя.

Сваякі таксама не заўсёды глядзелі на захапленне Воранава галубамі прыхільна. Казалі, што справа гэта бесталковая і нават дзіцячая. Аднак кожнаму чалавеку патрэбен свой спосаб для адпачынку. Нават свойскія каты, і тыя змірыліся.

— Каты павінны сябраваць з галубамі, — не мае сумненняў Мікалай. — Я сваіх катоў выхоўваю: ад маленства паказваю ім птушак і вучу, што чапаць іх нельга. Ведаеце, атрымліваецца! Мой Рыжы яшчэ кацянём як толькі пачынаў паляваць на птушак, так яго адразу па вуху, і ён урэшце зразумеў, што нападаць нельга.

Новае захапленне галубятніка — пара белых паштовых галубоў. Пакуль ён яшчэ не прыдумаў, куды і каму дасылаць з імі лісты, але ў інтэрнэце прачытаў, што адзін паштовы голуб праз некалькі гадоў з Францыі дадому вярнуўся. Ён упэўнены, што яго голуб і галубка ўжо не паляцяць у Кіеў, адкуль яны родам, але будуць радасцю клімавіцкіх людзей.

Дарэчы, адзін з белых галубоў Воранава перажыў ужо чатыры вяселлі. Птушка вяртаецца дадому, хоць і не з'яўляецца паштовай. За гэта гаспадар называе голуба шчаслівым. Напэўна, ён і закаханым маладым прыносіць шчасце.

Колькі ж каштуе атрымаць галубоў на вяселле? Не так і дорага: столькі, колькі патрабуецца для пракорму птушкі. Мех зерня — паўсотні тысяч рублёў. «Даходу ад галубоў, вядома, няма, але гэта вялікае задавальненне для душы», — кажа гаспадар птушак Воранаў. Ён лічыць, што здароўе і нервы даражэйшыя за выдаткі. І любуецца сваімі галубамі.

Ілона ІВАНОВА.
Фота аўтара.
г. Клімавічы.

Усё вяртаецца ізноў.
І нават снег, які вясною,
Не развітаўшыся, пайшоў,
Кружляе над старой вярбою
І ніц кладзецца ля муроў —
Снягі вяртаюцца ізноў.
Ці вернешся са снегам ты
З твайго прытулку каля мора,
Дзе не чуваць завейных хораў
І вечнасць развяла масты?
Не вернешся са снегам ты.
Мо прыйдзе з гэтым снегам час,
Той, залацісты, яснадзённы,
Тваім санетам браславёны,
Прадвешчаны табою час...
Усё вяртаецца да нас.

«Газель» сутыкнулася з дрэвам

Раніцай у МНС паступіла паведамленне: на аўтадарозе Р-23 Мінск — Мікашэвічы паблізу вёскі Беліца Мінскага раёна адбылося дарожна-транспартнае здарэнне. Вадзіцель грузавога аўтамабіля «Газель» не справіўся з кіраваннем. У выніку аўтамашына, у якой знаходзіліся тры чалавекі — кіроўца і два пасажыры, з'ехала ў кювет і сутыкнулася з дрэвам. Выратавальнікам давялося пры дапамозе гідраўлічнага інструменту вызваляць вадзіцеля і пасажыра-жанчыну. Яны былі дастаўлены ў бальніцу.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Вершасклон

Янка ЛАЙКОЎ



ПАЛЯВАННЕ

выехалі на паляванне
тры вершнікі

бязлітасны час
міласэрны час
абыякавы час

гудзе паляўнічы рог
коні панура брыдуць
праз вечнасць
напяты слых

кропка ў небе
тры стрэлы

бязлітасны час параніў
міласэрны час забіў
абыякавы час
пусціў сабе кулю ў сэрца

на пустэльнай зямлі
сцякае крывёй
мёртвая памяць

* * *

Слухай ноч,
працятую аглушальнаю цішаю,
слухай, як напінаецца ціш,
выштурхоўвае нас з сябе, —
нараджаецца, вышае,
уздымаецца над прасцягамі,
уразаецца ў сэрца глыбей
нешта, што ёсць невымоўнае,
неспазнанае, поўнае
жуды, трымцення смяротнага,
прагі жыцця,
нешта таемнае, роспачнае,
малітоўнае,
даверлівае і кволае,
святое, нібы дзіця...
Слухай ноч, слухай ноч,
ашалелую, агаломшаную
тысячамі нябачных маланак,
пасланых звыш.
Нешта вечнае — там,
яно большае, большае,
захінае сабою Сусвет
і пераўтвараецца ў ціш.

ТОЙ БЕРАГ

Я памятаю, як Рака
гайдала ў водах цьмяных човен.
І нехта ў апранахах чорных
усіх, хто позніўся, гукаў.

І ў цемры нараджаўся стогн,
імкнуў да столі невідочнай.
Чакалі мы. І нашы вочы
пыталі марна: «Дзе ты, Бог?»

Шырэлі на вадзе кругі,шырэў
адчай на тварах шэрых.
І аддаляўся ў цемру бераг,
і набліжаўся той, другі.

Міналі хвілі, як гады,
трымцеў і нёсся ўгору пошчак.
І мы спыталі: »Перавозчык!
Куды вязеш ты нас, куды?»
І не пачулі мы адказ:
«У Небыццё вязу я вас!..»

ТАЙНА

Двое стаялі ля вышняй брамы,
насустрач Анёл ім выйшаў:
«Вы хто?» —
«Мы шукаем праўды,
але не зямной, а вышняй.»

Тады Анёл Аднаго паклікаў:
«Ідзі, для цябе
адчыняю Браму!»
І той увайшоў у праём.
І знік ён.
І ўслед яму гучала:
«Абраны...»

«Чаму? — запытаўся пасля
нябога, —
За Брамай — якаясь тайна?»
Анёл прашаптаў:
«Там няма нічога...»
І зарыдаў адчайна.

* * *

Вятры нізеюць за смугой,
снягі валодаюць самотай,
сляза сцякае за слязой
нібы пакрыўджана, употай.

Няхай віруе злы мой лёс,
мне даспадобы гэта роспач,
бо ўласных я не бачу слёз —
паэзія мне засціць вочы.

ДЗЕІ

датыкаюся да вытокаў
блытаюся ў нябачнай сетцы
дранцвею атручаны чаканнем
абуджаюся прасветлены
цемраю

выкоўзваюся з абдымкаў сну
выкоўзваюся ў бяссонне
аддаю даніну бяссэнсіцы
гукаю ў пустой прасторы

змагаюся да знямогі
трымаю тайну
маю надзею на жыццё

* * *

Крык
развінае крылы
на ўсе бакі небасхілу
і ападае, спрахлы,
у нетры страху.

А я,
непрытомны,
прымрою раптоўна:
то душа твая
беспрытульная
вусціш дратуе:
«Ратуй мяне!..»

Ёсць нагода? Ёсць пытанне!

У АЎСТРАЛІІ ЗНАХОДЗЯЦЬ ДОЛАРЫ, А Ў БЕЛАРУСІ — СПАДНІЦЫ, СТАТУЭТКІ І ЖОНАК

У піцэрыі Cafe Marko ў прыгарадзе Сіднея нехта пакінуў чамадан з мільёнам аўстралійскіх долараў (калі лічыць у амерыканскай валюце, сума будзе не нашмат меншай). Пра гэта паведаміла агенцтва Associated Press са спасылкай на тэлеканал Ten Network. Здзіўленню ўладальніка кавярні не было межаў, калі ў забытым чамадане ён знайшоў грошы. Мужчына палічыў патрэбным звярнуцца ў паліцыю, каб устанавіць паходжанне гэтага самага мільёна...

А ШТО БЫЛО САМАЙ НЕЧАКАНАЙ ЗНАХОДКАЙ У ВАШЫМ ЖЫЦЦІ?

Максім Ражкоў, вадзіцель таксі:

— Пасля працы часта знаходзіш у машыне самыя розныя рэчы. Часцей за ўсё гэта пальчаткі, упрыгажэнні, тэлефоны. Але аднойчы стаўлю машыну на стаяку, пераглядаю, ці няма чаго ў салоне — і раптам бачу сумку. Адкрываю — а там тварог хатні, яйкі, масла, два слоікі з нейкімі саленнямі. Карацей, проста клад для гарадскога чалавека. Нават і не змог зразумець, хто забыўся. Сказаць па праўдзе, была спакуса сабе ўсё пакінуць. І ўсё ж, вырашыў на ўсякі выпадак адвезці ў дыспетчарскую: раптам гаспадар будзе сумку шукаць.

Аліна Карпуць, інструктар па аэробіцы:

— Я марыла пра стыльную спадніцу ў клетку. Шукала па ўсіх крамах. І дзе знайшла? Перагледзела гардэроб мамы часоў яе дзяцюцтва! Спаднічку давялося ўсяго толькі зрабіць карацейшай. Пасля ўсе пыталіся, дзе можна набыць нешта падобнае: і тканіна шыкоўная, і сядзіць удала.

Зоя Валковіч, кандуктар:

— Неяк я прыехала ў вёску, дзе застаўся дом маіх бацькоў. Пайшла пашукаць нешта на гарышчы. За розным хламам разгледзела невялікую скрынку, дастала і адчыніла. Там ляжалі старыя пацеркі, сшыткі. Карацей, усё на свеце. Яшчэ там была статуэтка дзяўчыны з кветкамі ў руках. Я прывезла яе дадому, паставіла на палічку. Пасля да мужа прыйшоў знаёмы, які займаўся продажам антыкварыяту і сказаў, што гэта нейкі адмысловы дарагі фарфор, і каштуе такая фігурка немалых грошай.

Аляксандр Ставіцкі, юрыст:

— Самай нечаканай знаходкай для мяне стала жонка. Спадзяюся, яна не пакрыўдзіцца, што так яе назваў. Пазнаёміліся мы, калі я ляжаў у бальніцы са зламанай нагой. Яна ў гэтай бальніцы працавала. Мне тады зусім іншыя дзяўчаты падабаліся, гаварлівыя і крыху нахабныя. Ніколі не думаў, што буду адчуваць сябе так утульна побач са спакойнай і разважлівай.

Марына Наліўка, студэнтка:

— Для мяне што ні дзень, то нечаканая знаходка. Вось учора спатрэбілася калготкі набыць цёплыя. Прыходжу ў краму — 60 тысяч рублёў. Вочы так і акругліліся ад здзіўлення.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

Што звязвае салістаў «Бі-2» і паэта Аркадзя Куляшова?

Гасцёўня

Лёва і Шура з «Бі-2» расказалі, чаму не пішуць песень па-беларуску і як ставяцца да беларускай мовы

САЛІСТЫ расійскага рок-гурту «Бі-2», ураджэнцы Беларусі Лёва і Шура, на прэс-канферэнцыі ў Мінску прызналіся, што хвалююцца, калі выступаюць на радзіме.

— Выступаць у родным горадзе — нервы на мяжы. Ды і для арганізатараў нашых канцэртаў у Беларусі гэта заўсёды галаўны боль: ім даводзіцца кожны раз выдзяляць на нашы канцэрты, як мінімум, сто квіткоў для нашых сяброў, аднакласнікаў і г.д. І так не толькі ў Мінску (тут нарадзіўся Лёва. — **Аўт.**) ці Бабруйску (родны горад Шуры, сёння спявак — грамадзянін Аўстраліі. — **Аўт.**), але і ў Тэль-Авіве, Рызе — усюды, дзе ў нас шмат сяброў.

Падчас непрацяглай гутаркі з журналістамі музыканты расказалі, што пачынаць сольную кар'еру пакуль не збіраюцца:

— Куды б мы ні прыехалі, усе гэтым чамусьці цікавяцца. Але распаду «Бі-2» пакуль не будзе: адзін аднаму мы не надакучылі (сябруем з дзяцінства), таму нават паралельныя сольныя праекты таксама робім разам.

«За столькі гадоў мы яшчэ цудоўна разумеем беларускую мову»

— Эксперыментаў з беларускай мовай у нас не было ні ў адным з альбомаў. Мы спяваем толькі на рускай мове, — адказалі артысты на пытанне карэспандэнта «Звязды».

Шура патлумачыў гэта тым, што ўсё залежыць ад песні: калі будзе вартая песня на беларускай мове, то ўсё магчыма.

— Няма яшчэ такой песні, якая нас зацікавіла б. Сам я, напрыклад, не пішу песні па-беларуску. Нельга ставіць задачу — зрабіць песню на беларускай мове. У першую чаргу песня павінна быць добрай, а ўжо на якой мове — рускай, англійскай ці іўрыце — не мае значэння.

Лёва Бі-2: «Мы ў асноўным спяваем свае песні. Таму пытанне хутчэй у тым, ці прыйдзе натхненне ствараць па-беларуску...

Як прызналіся музыканты, беларускую мову яны ўсё ж памятаюць, аднак гаварыць на ёй ім складана. Дарэчы, адзін з салістаў гурту — Лёва — унук народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова...

— Ведаеце, як я ў вучылішчы атрымаў пяцёрку па беларускай мове і літаратуры? — пацікавіўся ў журналістаў Шура. — У Лёвы дзякуючы яго дзеду Аркадзю Куляшову была цудоўная бібліятэка, і я браў у яго перыядычна кнігі з аўтографамі і даваў іх сваёй настаўніцы па літаратуры. Кшталту: «Аркадзю Куляшову ад Янкі Купалы»...

Усё ж за столькі гадоў мы яшчэ цудоўна разумеем беларускую мову. Размаўляць цяжка, але разумець — разумеем.

Умоўны лад? Не пра нас!

Восьмы па ліку студыйны альбом пад назвай «Spirit» музыканты «Бі-2» афіцыйна прэзентуюць першага снежня. Тым не менш песні з новага альбома ўжо сёння можна паслухаць на сеткавым рэсурсе «portalplaneta.ru».

— Сацыяльная сетка «Планета» — унікальныя магчымасці, — дзеляцца досведам артысты. — Сабраць у адным месцы ўсю інтэлектуальную ўласнасць Расіі і даступна несці яе ў масы — гэта заслугоўвае павагі. Новы альбом мы выпускаем без дапамогі рэкард-лэйблаў і з нашымі прыхільнікамі кантактуем непасрэдна праз «Планету».

Сацыяльная сетка — не адзінае захапленне музыкаў, не так даўно яны арганізавалі сваё радыё «Субстанцыя», якое вяшчае сёння ў інтэрнэт-фармаце.

Яшчэ Шура і Лёва не любяць умоўнага ладу. Таму, калі спытаць, чым займаліся б, каб не музыка, даюць толькі адзін адказ — музыкай.

Ілья ЛАПАТО.

Адкрыты рахунак для ахвяраванняў сем'ям тых, хто загінуў у катастрофе «Еўракоптара»

Дзяржаўны памежны камітэт Беларусі адкрыў дабрачынныя рахункі для пералічэння ахвяраванняў сем'ям журналістаў і лётчыкаў, якія загінулі 20 кастрычніка ў авіякатастрофе. Атрымальнік сродкаў: Дзяржаўны памежны камітэт Рэспублікі Беларусь (УНП 100678044).

Дабрачынныя рахункі:

№ 3642901555024 — у беларускіх рублях;

№ 3642901555053 — у расійскіх рублях у спецыялізаваным упраўленні Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь г. Мінска, код 024.

Верталёт «Еўракоптар» органаў памежнай службы разбіўся 20 кастрычніка ў раёне вёскі Вілейты прыкладна за кіламетр ад беларуска-літоўскай мяжы. На борце знаходзіліся два члены экіпажа (Ігар Скварцоў 1965 г.н. і Андрэй Пякарскі 1979 г.н.) і здымачная група тэлерадыёаб'яднання «Саюз» (Юлія Шатэрнік 1983 г.н., Віталь Прачкоўскі 1974 г.н. і Сяргей Шамалаў 1972 г.н.). Усе яны загінулі. «Еўракоптар» выконваў планавы палёт па ахове дзяржаўнай мяжы.

ЯК АБАРАНІЦЬ ДЗІЦЯЧЫЯ НОЖКІ?

Чаму стандартная артапедычная вусцілка не дае чаканага эфекту

БЕЛАРУСКІЯ медыкі сцвярджаюць, што амаль палова нашага насельніцтва пакутуе на розныя захворванні апорна-рухальнага апарату, і адну з лідзіруючых пазіцый тут займае плоскаступнёвасць. Асаблівую занепакоенасць спецыялістаў выклікае стан здароўя дзяцей і моладзі.

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт правёў абследаванне, якое выявіла, што за перыяд з 2000 па 2004 год у самім горадзе Гродна і Гродзенскай вобласці з 54,5 тысячы юнакоў прызыўнога ўзросту 930 былі прызнаны нягоднымі да праходжання тэрміновай службы з-за розных відаў паталогіі ступні. У асноўным у прызыўнікоў выяўлялася цяжкая форма плоскаступнёвасці, якая ў многіх выпадках пры своечасовай кваліфікаванай артапедычнай дапамозе магла б быць паспяхова выпраўлена.

У 2004-2005 гадах спецыялісты Гродзенскага медуніверсітэта сумесна са сваімі калегамі з Навукова-даследчага цэнтра праблем рэсурсазберажэння НАН Беларусі правялі абследаванне амаль 6 тысяч вучняў 1-10 класаў. У 31 працэнта даследаваных школьнікаў былі выяўлены дысфункцыі ступні. Прычым найчасцей плоскаступнёвасць сустракалася ў дзетак 3-4 і 6-7 класаў (прыблізна на 10-20% вышэй, чым у іншых класах). У цэлым плоскаступнёвасць склала 88% усіх дысфункцый ступні дзяцей, абследаваных у Гродзенскай вобласці, і найчасцей яна сустракаецца менавіта ў малодшых школьнікаў.

МІНУСЫ «СТАНДАРТУ»

Заняткі спортам і спецыяльныя фізічныя практыкаванні многім дзеткам дапамагаюць выправіць ножку. Апроч таго, апошнім часам асобай папулярнасцю сталі карыстацца артапедычныя вусцілкі. Яны сёння прадаюцца ў аптэках, абутковых магазінах, кіёсках і г.д. Рэклама настойліва пераконвае ў іх эфектыўнасці, але мала хто са спажыўцоў разумее, што пасапраўднаму карыснай можа быць толькі вусцілка, зробленая па індывідуальным заказе. У нашай краіне такія выпускае РУП «Беларускі пратэзна-артапедычны аднаўленчы цэнтр».

— Трэба разумець, што вусцілка, набытая ў магазіне ці аптэцы, гэта — усярэднены, стандартны выраб, які па сваім функцыянальным прызначэнні можа не адпавядаць канкрэтнаму чалавеку, — патлумачыў нашаму журналісту **генеральны дырэктар згаданага цэнтра Іван Мікалаевіч ВОЛКАЎ**. — Мы ж вырабляем яе індывідуальна. У нас выкарыстоўваецца найноўшае абсталяванне для сканіравання. Работа з кліентам пачынаецца з дыягностыкі захворвання, якую праводзяць нашы спецыялісты (выяўляецца плоскаступнёвасць і іншыя дэфекты ступні). Потым падбіраецца індывідуальная вусцілка, у якой заказчык робіць пробныя крокі. Пры гэтым на камп'ютары адбіваюцца нагрузкі на пэўныя ўчасткі яго ступні — да прымянення нашых вусцілак і пасля іх прымянення, з улікам чаго ўрач бачыць, у якім канкрэтна месцы неабходна ўстанавіць артапедычнае абсталяванне. Такая вусцілка, зробленая на заказ і прыдатная для нагі аднаго чалавека, можа зусім не падысці другому, хоць у абодвух будзе аднолькавы дыягназ — плоскаступнёвасць.

Мы «падганяем» вусцілку пад нагу канкрэтнага чалавека. Уся інфармацыя, характарыстыкі і памеры ступні заказчыка застаюцца ў камп'ютары, да якіх заўсёды можна вярнуцца пазней пры вырабе новай пары. Калі справа тычыцца дзетак, мы рэкамендуем дзесьці праз паўгода зноў звярнуцца да нас — для таго, каб пабачыць вынікі выкарыстання гэтага артапедычнага прыстасавання.

Бацькі ведаюць, як складана падабраць малому абутак патрэбнага памеру. Не менш цяжкасцяў выклікае і выбар артапедычнай вусцілкі. У працэсе нашэння не падагнаная належным чынам па назе вусцілка можа змінацца і з'язджаць. Адпаведна будзе змяшчацца прыстасаванне, якое падтрымлівае звод ступні, што значна знізіць яе артапедычную эфектыўнасць. Калі ж выкарыстаць вусцілку, зробленую на заказ, па індывідуальным памеры, такое выключаецца.

— Вусцілка, набытая ў звычайным кіёску ці абутковым магазіне, зробленая па стандарце, не дае такога значнага станоўчага эфекту, бо не падганяецца індывідуальна па ступні, — пацвердзіў Іван Мікалаевіч. — Апроч таго, ніхто не кантралюе вынікі яе выкарыстання, як гэта робім мы.

Артапедычныя дзіцячыя вусцілкі, выраблены ў РУП БПААЦ, у большасці выпадкаў даюць станоўчы эфект. Пры замене абутку на большы памер неабходна замяніць і вусцілку.

Увогуле, працэс фарміравання ступні працягваецца да 16-18 гадоў, таму калі своечасова ўзяцца за справу (яшчэ ў дзяцінстве выявіць захворванне і прыняць належныя меры), то да наступлення паўналецця можна выправіць плоскаступнёвасць, увогуле пазбавіць чалавека ад неабходнасці выкарыстоўваць артапедычныя прыстасаванні.

Што тычыцца дарослых, ім лячэбнага эфекту (аднаўлення функцыі ступні ў поўным аб'ёме) ужо чакаць не варта па прычыне спынення росту нагі. Аднак пры гэтым не страчвае значэння тэрапеўтычны эфект.

— Наша ступня, а дакладней яе звод, — гэта рысора, якая пастаянна павінна выконваць функцыю амартызацыі пры хадзьбе, змякчаць аддачу ў суставы і пазваночнік. Плоскаступнёвасць (адсутнасць такой рысоры) азначае пастаянную нагрузку на пазваночнік і ніжнія канечнасці, — патлумачыў Іван Мікалаевіч. — Уявіце, што вы рухаецеся ў аўтамабілі без рысор... Тады кожную яміну і ўзгорак вы будзеце адчуваць літаральна ўсім целам. Тое ж і пры плоскаступнёвасці. Калі ступня не працуе як амартызатар, то ўсе няроўнасці паверхні пры хадзьбе будуць адбівацца на пазваночніку. Наша артапедычная вусцілка з падтрымлівальным зводам дае прымусовую амартызацыю і зусім іншае (больш бяспечнае для здароўя) размеркаванне нагрузкі... Дарослым мяняць артапедычныя вусцілкі трэба па меры зносу ці пры замене абутку.

Цікава, што іх эфектыўнасць ужо ацанілі нашы хакеісты, якія заказваюць індывідуальныя артапедычныя вусцілкі ў чаравікі канькоў. Хто бачыў, ведае, што хакейны чаравік мае абсалютна плоскую падэшву, а артапедычныя вусцілкі дапамагаюць раўнамерна размеркаваць нагрузку на ступню. Разгружаюцца ікраножныя мышцы, а значыць, можна больш часу праводзіць на лёдзе, не адчуваючы дыскамфорту. Раней нашы хакеісты набывалі такія вусцілкі за мяжой і плацілі за іх у разы больш.

БЕЗ ЧАРГІ І ТАННА

У свой час Савет Міністраў зацвердзіў пералік тэхнічных сродкаў рэабілітацыі, якія для пэўнай катэгорыі грамадзян (пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў) прадастаўляюцца бясплатна ці на льготных умовах. Спіс налічвае больш за чатыры дзясяткі найменняў. З іх 37 — выробляе РУП БПААЦ. Аднак артапедычныя вусцілкі сюды не ўваходзяць і таму вырабляюцца за наяўны разлік. Сёння гэта да 100 тысяч рублёў за пару. Аднак цана можа вырасці, папярэджваюць у цэнтры, бо матэрыялы прымяняюцца імпартныя (у прыватнасці, успенены поліэтылен рознай шчыльнасці, які валодае якасцю тэрмафіксацыі).

Дыягностыка плоскаступнёвасці ў цэнтры ажыццяўляецца бясплатна. Чаргі на выкананне заказу няма. Кожны, хто звернецца ў Беларускі пратэзна-артапедычны аднаўленчы цэнтр, на працягу 10-15 дзён атрымае гатовыя вусцілкі.

ПАДТРЫМКА ДЛЯ СПІНЫ

Многія дзеці сёння вядуць значна больш пасіўны лад жыцця, чым іх равеснікі яшчэ 30-50 гадоў таму, што абумоўлівае рост захворванняў на скаліёз, што ў сваю чаргу можа прывесці да захворванняў тазасцегнавых суставаў, зашчамлення нервовых канчаткаў міжпазваночнымі дыскамі, з'яўлення грыж і г.д. Скрыўленне пазваночніка, як правіла, можна выправіць, калі своечасова прымяніць гарсэт і іншыя карыгіруючыя прылады для карэкціроўкі фігуры.

Беларускі пратэзна-артапедычны аднаўленчы цэнтр вырабляе шырокі спектр такіх тавараў. І не толькі для дзяцей, але і для дарослых.

Сёння шматлікія тэлевізійныя крамы прапануюць «цудадзейныя» паясы, гарсэты, бандажы і накладкі, якія быццам бы здымаюць нагрузку з пазваночніка і пазбаўляюць ад болю. Але каштуе такое задавальненне зусім не танна. Калі ў вас узнікла неабходнасць у такой прыладзе, лепш звярнуцца ў Беларускі пратэзна-артапедычны аднаўленчы цэнтр, дзе можна падабраць больш якасны аналаг па вельмі дэмакратычнай цане. Напрыклад, антырадыкулітны гарсэт у залежнасці ад мадэлі сёння каштуе 80-100 тысяч рублёў. Можна набыць стандартны гарсэт, а можна пашыць яго на заказ.

— Мы ўсю сваю прадукцыю вырабляем з натуральных — баваўняных і льняных — тканін, а тое, што рэкламуецца, у аснове мае сінтэтыку. Адсюль з'яўленне розных алергічных высыпанняў, раздражненняў і г.д. Якасць пашыву такіх тавараў таксама не самая высокая. А ў нас уся прадукцыя адпавядае тэхнічным стандартам сусветнага ўзору. Наша прадпрыемства мае сертыфікаты адпаведнасці, якія сведчаць аб тым, што сістэма менеджменту якасці распрацоўкі, вытворчасці пратэзна-артапедычных вырабаў, артапедычнага абутку і тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі адпавядае айчынным і міжнародным стандартам. На ўсе віды нашай прадукцыі ёсць гарантыя. Нашы спецыялісты перыядычна праходзяць за мяжой стажыроўку па вытворчасці артапедычных вырабаў.

Нагадаем, што прадукцыю цэнтра можна набыць ці замовіць не толькі ў Мінску, але і ва ўсіх яго абласных філіялах.

Інга МІНДАЛЁВА.

P.S. *Газета «Звязда» далучаецца да віншаванняў генеральнага дырэктара Беларускага пратэзна-артапедычнага аднаўленчага цэнтра Івана Волкава з нагоды ўзнагароджання яго ордэнам Пашаны.*

ЦЯГНІКОЎ БУДЗЕ БОЛЬШ

БЕЛАРУСКАЯ чыгунка інфармуе патэнцыйных пасажыраў пра павелічэнне ў раскладзе руху колькасці цягнікоў.

У прыватнасці, як паведамілі рэдакцыі ў Мінскім аддзяленні, гаворка ідзе пра наступныя дадатковыя цягнікі. 4, 11, 18 і 25 снежня ў раскладзе з'явіцца цягнік № 631 Гомель — Мінск, які будзе адпраўляцца з Гомеля ў 23.59 і прыбываць у сталіцу ў 5.54. 28 снежня, 4 студзеня, 22 лютага, 7 сакавіка і 25 красавіка наступнага года пасажыры змогуць скарыстацца паслугамі цягніка №11 Масква — Мінск. Ён будзе выпраўляцца з белакаменнай у 21.09 і прыбываць у Мінск у 5.32. 29 снежня, а таксама 5 студзеня, 23 лютага, 8 сакавіка і 26 красавіка да паслуг ахвотных — дадатковы цягнік № 12 Мінск — Масква. Адпраўляцца з нашай сталіцы ён будзе ў 23.15, прыбываць у Маскву — у 9.37.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА.

АЎТАРСКІ КОНКУРС-15



Яго правадзіць Пётр Шклудаў з Наваполацка — чэмпіён краіны, нацыянальны майстар спорту па шашачнай кампазіцыі, трэці прызёр першынства рэспублікі па завочнай гульні. Яшчэ ён вядомы як тэарэтык: распрацаваў Кодэкс для беларускіх складальнікаў задач, праблем і эцюдаў-64 і 100, а таксама Міжнародныя правілы стварэння камбінацыйных праблем і эцюдаў-64.

Маэстра падрыхтаваў свае ўласныя творы, а таксама прызы для пераможцаў. Усяго будзе 24 заданні. Кожнае ацэньваецца ў адно ачко. Конкурс, да таго ж, з'яўляецца класіфікацыйным з нормай першага спартыўнага разраду, у ім могуць прыняць удзел усе ахвотныя. Сёння паўтараем першае з іх і падаём чарговае:



№ 1. **Белыя**: c1, дамкі c5, e7 (3). **Чорныя**: a7, c3, дамка a1 (3).

№ 2 (эцюд аформлены ў дамачную мініяцюру). **Белыя**: b4, f2, g1, дамкі c5, d6 (5). **Чорныя**: a5, a7, h4, дамкі c3, d2 (5).

Пашукайце пераможныя хады за белых.

«ПАГОДА Ў ДОМЕ-2011»

Конкурс працягваецца заданнем № 22:



Белыя: a1, a3, a7, d2, e3, f2, g3, h2, h6 (9). **Чорныя**: a5, b4, c3, c5, d6, e5, f8, g7, h4 (9). Выйгрыш.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі»**.

РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

Аўтарскі-14/20 (В. Шульга): 8, 13, 50-44, 11, 43, 7, 34, 1, 24, 14 (20,10) 20x.

«Пагода ў доме»-8/17 (М. Грушэўскі): c3, e7 (d6) a3, c1 (g7) g5 (h6) f6x.

Бліц-63/2 і па-за конкурсам (А. Кагоцька): **№ 1.** e5, f6, b8, c1, a3+, **№ 2.** b8, d8, f2, h6, c1 (a3 A), e1 (cb2), b4+. A(b6, a3), c5 (d2), h6, d4+ і **№ 3.** c3, e3, cb8, c1 (g3, f2, g1), f8 (d4), c5+. Наш кансультант Аляксандр Палявы (Ізраіль) заўважыў іншыя развязкі: у № 1 — 1. e5/d8/g5x, № 2 — 5. h:c1 ab6 6. fa7 ba3. Аўтарскае 7. a7-b8? (прыватныя пабочныя магчымасці 7. ab6/ac5/af2/ag1x) cb2 8. be5 ba1 9.eh8x. Не развязваецца 7...ab2 8. c:a3 cd2= і № 3 — 1. dc3/e3x.

Факт

Варонка дыяметрам 15 метраў

утварылася пасля выбуху авіяцыйнай бомбы, якую знішчылі ў Калінкавіцкім раёне спецыялісты ваеннай часці 5525.

Як паведамілі ў прэс-групе КДБ па Гомельскай вобласці, ля вёскі Гулевічы моладдзю і ветэранамі добраўпарадкоўваецца месца партызанскай стаянкі. Юнакам з клуба «Пошук» спатрэбіўся мох, які яны бралі за 100 метраў ад месца будучага мемарыяла. Менавіта там маладыя людзі раптам убачылі частку прадмета, які тырчаў з-пад зямлі і выклікаў падазрэнне. Кіраўнік клуба адразу звярнуўся да чэкістаў, якія выклікалі сапёраў. На месцы здарэння былі знойдзены дзве авіяцыйныя бомбы ФАБ-500 і АО-10. Першая з зарадам 250 кг у трацілавым эквіваленце, другая — 0,7 кг. Было прынята рашэнне знішчыць боепрыпасы, якія знаходзіліся ў баявым стане, на месцы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Калі гарэлка наверх лезе

У Жабінцы нецвярозы 19-гадовы юнак познім вечарам кінуў каменем у акно крамы. Вядома, шкло разляцелася. Цяпер яму давядзецца кампенсаваць урон і адказваць за хуліганства.

А ў вёсцы Яечкавічы Іванаўскага раёна яшчэ адзін малады чалавек на добрым падпітку забаўляў сябе тым, што варочаў слупы ад дарожных знакаў — прычым вывернуў аж шэсць апор. Начны «волат» устаноўлены. Ім аказаўся 22-гадовы непрацуючы жыхар вёскі Еўлашы.

Яна СВЕТАВА.

Краму «ўзялі» студэнты

А чацвёртай гадзіне ночы нарад Аршанскага аддзела аховы паблізу гарадскога пасёлка Бабінічы ў аўтамашыне «Сітраен» без рэгістрацыйных знакаў затрымаў двух студэнтаў.

Яны падазраюцца ў тым, што ноччу абрабавалі краму спажывецкай кааперацыі ў вёсцы Славені Шклоўскага раёна — скралі тавараў на агульную суму 7 мільёнаў рублёў. Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Дополнительное извещение о проведении аукционных торгов

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

28 декабря 2011 года проводит 14-й, 15-й, 16-й, 17-й и 18-й повторные открытые аукционы на 20-м открытом аукционе по продаже имущества республиканской собственности

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч, износ в %	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
Повторный 14 аукцион						
107	Хопер-дозатор № 53072666, 4 кат., КР-1999 г.	г. Жодино в/ч 18662	1977	90	21 000 000	2 100 000
108	Хопер-дозатор № 53072807, 4 кат., КР-1998 г.	г. Жодино в/ч 18662	1977	90	21 000 000	2 100 000
109	Хопер-дозатор № 53072641, 4 кат., КР-1998 г.	г. Жодино в/ч 18662	1977	90	21 000 000	2 100 000
110	Хопер-дозатор № 53072732, 4 кат., КР-1998 г.	г. Жодино в/ч 18662	1977	90	21 000 000	2 100 000
111	Хопер-дозатор № 53072740, 4 кат., КР-1998 г.	г. Жодино в/ч 18662	1977	90	21 000 000	2 100 000
112	Хопер-дозатор № 53072757, 4 кат., КР-1998 г.	г. Жодино в/ч 18662	1977	90	21 000 000	2 100 000
113	Хопер-дозатор № 53072765, 4 кат., КР-1999 г.	г. Жодино в/ч 18662	1977	90	21 000 000	2 100 000
114	Хопер-дозатор № 53072781, 4 кат., КР-1998 г.	г. Жодино в/ч 18662	1977	90	21 000 000	2 100 000
115	Хопер-дозатор № 53072674, 4 кат., КР-2006 г.	г. Жодино в/ч 18662	1977	90	21 000 000	2 100 000
Повторный 15 аукцион						
119	Хопер-дозатор № 53073136, 4 кат., КР-1998 г.	г. Жодино в/ч 18662	1977	90	21 000 000	2 100 000
120	Хопер-дозатор № 53073144, 4 кат., КР-1999 г.	г. Жодино в/ч 18662	1977	90	21 000 000	2 100 000
121	Хопер-дозатор № 53072880, 4 кат., КР-1998 г.	г. Жодино в/ч 18662	1977	90	21 000 000	2 100 000
122	Хопер-дозатор № 53072823, 4 кат., КР-1998 г.	г. Жодино в/ч 18662	1977	90	21 000 000	2 100 000
124	Хопер-дозатор № 53072633, 4 кат., КР-1998 г.	г. Жодино в/ч 18662	1977	90	21 000 000	2 100 000
125	Хопер-дозатор № 53072724, 4 кат., КР-1998 г.	г. Жодино в/ч 18662	1977	90	21 000 000	2 100 000
127	Хопер-дозатор № 53072708, 4 кат., КР-1998 г.	г. Жодино в/ч 18662	1977	90	21 000 000	2 100 000
129	Хопер-дозатор № 53072971, 4 кат., КР-1999 г.	г. Жодино в/ч 18662	1988	90	21 000 000	2 100 000
Повторный 16 аукцион						
144	Автошасси КамАЗ-4310, ш. 0033499, дв. 0110754, 4 кат.	г. Борисов в/ч 20193	1987	133 102	35 000 000	3 500 000
145	Грузовой КамАЗ-4310, ш. 0029435, дв. 0056962, 3 кат.	г. Борисов в/ч 20193	1986	99 525	40 000 000	4 000 000
Повторный 17 аукцион						
157	АЦ-8-5334 (автоцистерна), с/о А8610199 на МАЗ-5334 ш. 83108, дв. 8801760, 4 кат.	н.п. Михановичи в/ч 52188	1986	36 281 км, 811 м/ч	86 000 000	8 600 000
158	АЦ-8-5334 (автоцистерна), с/о А8610141 на МАЗ-5334 ш. 82650, дв. 747207, 4 кат.	н.п. Михановичи в/ч 52188	1986	32 741 км, 487 м/ч	70 000 000	7 000 000
159	АЦ-8-5334 (автоцистерна), с/о А8320134 на МАЗ-5334 ш. 83223, дв. 748801, 4 кат.	н.п. Михановичи в/ч 52188	1986	27 261 км, 637 м/ч	71 000 000	7 100 000
163	АЦ-8,7-5320 (автоцистерна) с/о 182 на КамАЗ-5320 ш. 199942, дв. 686032, 4 кат.	н.п. Михановичи в/ч 52188	1985	125 371 км, 148 м/ч	28 000 000	2 800 000
167	Труба алюминиевая из комплекта ПМТА-150 2 кат., партия 50 шт.	п/о Лионово р-н Оранчицы в/ч 67675	1979	-	60 000 000	6 000 000
167а	Труба алюминиевая из комплекта ПМТА-150 2 кат., партия 50 шт.	п/о Лионово р-н Оранчицы в/ч 67675	1979	-	60 000 000	6 000 000
167в	Труба алюминиевая из комплекта ПМТА-150 2 кат., партия 50 шт.	п/о Лионово р-н Оранчицы в/ч 67675	1979	-	60 000 000	6 000 000
167с	Труба алюминиевая из комплекта ПМТА-150 2 кат., партия 50 шт.	п/о Лионово р-н Оранчицы в/ч 67675	1979	-	60 000 000	6 000 000
167d	Труба алюминиевая из комплекта ПМТА-150 2 кат., партия 62 шт.	п/о Лионово р-н Оранчицы в/ч 67675	1979	-	74 400 000	7 440 000
Повторный 18 аукцион						
172	Грузовой КамАЗ-43105, ш. 016033, дв. 991955, 3 кат.	г. Барановичи в/ч 29969	1986	111 965	42 000 000	4 200 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж в 11.00 28 декабря 2011 г.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы **до 16.00 23 декабря 2011 года.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 28 декабря 2011 г.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 09 98, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

Организатор аукциона:
фонд «Минскоблгосимущество»,
г. Минск, ул. Чкалова, 5,
тел.: (8017) 224 39 76, (8017) 228 60 13
Место проведения аукциона:
г. Минск, ул. Чкалова, 5

Дата и время проведения аукциона:
30 декабря 2011 г. в 9.30

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
по продаже недвижимого имущества, находящегося в республиканской собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков для его обслуживания, которые составляют единый предмет аукциона

лот № 1

Недвижимое имущество и право заключения договора аренды земельного участка. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-61798) – одноэтажное **здание конюшни** общей площадью 83,8 кв.м, 1977 года постройки, фундамент бетонный, стены и перегородки шлакобетонные, чердачное перекрытие деревянное, крыша шиферная. Принадлежности: дощатый сарай (25 кв.м). Объект расположен на земельном участке площадью 0,0200 га по адресу: Минская обл., Молодечненский район, д. Раевка, назначение: земельный участок для строительства и обслуживания здания конюшни. Введены ограничения в использовании земельного участка в связи с его нахождением в водоохранной зоне реки Рыбчанка вне прибрежной полосы. Срок аренды земельного участка – 20 лет. **Направления возможного использования земельного участка:** возможно изменение в установленном порядке целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов производственного назначения, которые не являются источниками вредных веществ, шума и вибрации.

Начальная цена предмета аукциона: 12 216 980 рублей (в т.ч. объект – 12 091 325 рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 125 655 рублей). **Размер задатка: 1 200 000** рублей.

Продавец: республиканское унитарное производственное предприятие «Новосверженский лесозавод» (Минская обл., Столбцовский район, д. Новый Свержень, ул. Железнодорожная, 8, тел.: (801717) 46683, 46400). **Арендодатель земельного участка:** Молодечненский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Молодечно, ул. Виленская, 6, тел. (80176) 71663).

лот № 2

Недвижимое имущество и право заключения договора аренды земельного участка.

Капитальное строение (инв. № 602/С-13342) – одноэтажные **производственно-вспомогательные и бытовые помещения тепличного комбината** общей площадью 816,0 кв.м, 1993 года постройки, фундамент бетонированный, стены – железобетонные панели, кирпич, перегородки кирпичные, чердачные перекрытия – железобетонные плиты, крыша совмещено-рулонная, подведены инженерные коммуникации. Составные части и принадлежности: кирпичное здание КПП (9 кв.м), ограждение – бетонные плиты на бетонных столбах (1356,2 м), ограждение – металлическая сетка на бетонных столбах (422,8 м), металлические ворота, две металлические калитки, автодороги тепличного комбината – цементобетонное покрытие (9574 кв.м), тротуар – цементобетонное покрытие (177 кв.м).

Капитальное строение (инв. № 602/С-13348) – одноэтажная **канализационная насосная станция тепличного комбината** общей площадью 50,3 кв.м, 1993 года постройки, фундамент – монолитожелезобетон, стены кирпичные, перегородки кирпичные, чердачные перекрытия – железобетонные плиты, крыша – рулонное покрытие, подведены инженерные коммуникации.

Капитальное строение (инв. № 602/С-13350) – **резервуар дождевых стоков тепличного комбината** общей площадью 2640,4 кв.м, 1993 года постройки, фундамент, стены и полы железобетонные.

Капитальное строение (инв. № 602/С-13351) – одноэтажный **блок зимних почвенных теплиц тепличного комбината** общей площадью 31040,0 кв.м, 1993 года постройки, фундамент бетонный, стены – несущая конструкция из металлического каркаса с остеклением, перегородки – металлический каркас с остеклением, крыша – металлический каркас с остеклением, подведены инженерные коммуникации.

Капитальное строение (инв. № 602/С-13352) – одноэтажный **склад тары (удобрений) тепличного комбината** общей площадью 290,8 кв.м, 1993 года постройки, фундамент – железобетонные блоки, стены – железобетонные панели, кирпичные, перегородки кирпичные, чердачные перекрытия – железобетонные плиты, крыша совмещенная рулонная, подведены инженерные коммуникации.

Капитальное строение (инв. № 602/С-13354) – одноэтажное **здание энергетического пункта тепличного комбината** общей площадью 295,8 кв.м, 1993 года постройки, фундамент бетонированный, ленточный, стены и перегородки – железобетонные панели, кирпичные, чердачные перекрытия – железобетонные плиты, крыша совмещенная рулонная, подведены инженерные коммуникации.

Капитальное строение (инв. № 602/С-31207) – одноэтажная **водопроводная насосная станция тепличного комбината** с подвалом общей площадью 25,4 кв.м, 1993 года постройки, фундамент – железобетон без отделки плит, стены кирпичные, чердачные перекрытия – железобетонные плиты, крыша совмещено-рулонная.

Капитальное строение (инв. № 602/С-43215) – **внутриплощадочные тепловые сети тепличного комбината** протяженностью 485,2 м, 1992 года ввода в эксплуатацию. Составные элементы: участок сети от магистральной сети до здания АБК, участок сети от теплицы до склада тары, участок сети от теплицы до КНС.

Капитальное строение (инв. № 602/С-43216) – **внутриплощадочные сети электроснабжения 0,4 кВ и наружного освещения тепличного комбината** протяженностью 2150,9 м, 1993 года ввода в эксплуатацию. Составные элементы: линии 1–4.

Капитальное строение (инв. № 602/С-43217) – **внутриплощадочные сети водопровода и канализации тепличного комбината** протяженностью 4015,1 м, 1993 года ввода в эксплуатацию. Составные элементы: сети водопровода тепличного комбината (хозяйственно-питьевой водопровод (1785,3 м) и поливочный водопровод (374,1 м), сети хозяйственно-фекальной канализации тепличного комбината (1036,7 м), сети промышленно-ливневой канализации (819 м).

Капитальное строение (инв. № 602/С-43230) – **трубопровод напорной канализации от КНС тепличного комбината** протяженностью 2549,8 м, 1993 года ввода в эксплуатацию.

Объекты расположены на земельном участке площадью 18,1776 га по адресу: Минская обл., Пуховичский район, д. Остров, назначение: земельный участок для ведения тепличного хозяйства. Введены ограничения в использовании части земельного участка площадью 0,713 га в связи с нахождением в охранной зоне ЛЭП свыше 1000 В. Срок аренды земельного участка – 10 лет. **Направления возможного использования земельного участка:** возможно в установленном законодательством порядке изменение целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов производственного и непроизводственного, административно-складского назначения, которые не являются источниками вредных веществ, шума и вибрации.

Начальная цена предмета аукциона: 3 398 296 607 рублей (в т.ч. объекты – 3 118 691 167 рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 279 605 440 рублей). **Размер задатка: 300 000 000** рублей.

Продавец: Минское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «Минскэнерго» (г. Минск, ул. Аранская, 24, тел. (8017) 2184297, 2238103, 2272111). **Арендодатель земельного участка:** Пуховичский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, тел. (801713) 52166).

Последний день подачи заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **28 декабря 2011 г. до 12.00. Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 28 декабря 2011 г.** включительно.

Текущий (расчетный) счет для внесения задатка для участия в аукционах: № 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе.

Участник аукциона, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких предметов аукциона, вносит задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 310, 312.**

Информация о предметах аукциона дополнительно размещается на сайте Минского облисполкома www.minsk-region.gov.by на странице фонда «Минскоблгосимущество».

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок необходимо подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, к которому прилагаются следующие документы: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированные участники для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагают: оригинал и копию договора о совместном участии в аукционе; заверенную банком копию платежного поручения о перечислении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Фонд «Минскоблгосимущество» вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала проведения аукциона по каждому объекту, выставляемому на аукцион.

Победители аукциона (претенденты на покупку) обязаны: 1. Подписать протокол о результатах аукциона. 2. В течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения исполнительными комитетами), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Па гарызанталі: Мараль. Мажуха. Пасол. Пагон. Сцяг. Багіня. Ружа. Камета. Сонца. Марс. Лік. Такса. Дрыгва. Гар. Арка. Птах. Ку. Зра. Онуч